

В. Нікалаюк з Курашава ☞ 3


# Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ


ЯЛОЎКА ☞ 8




http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 41 (2578) Год L | Беласток, 9 кастрычніка 2005 г. | Цана 2,00 зл.





Фота ЮЛІІ ДАРАШКЕВІЧ

Аляксандр Мілінкевіч (другі справа) з жонкай Інай Кулей галасуюць у час Кангрэса

# Разам да канца

**— Кожны з чатырох прэтэндэнтаў, якія хочуць стаць адзіным кандыдатам ад дэмакратычных сіл на маючых адбыцца ў 2006 годзе прэзідэнцкіх выбарах — варты гэтага пачэснага звання, — так ахарактарызаваў з трыбуны кангрэса сваіх калег па кааліцыі былы старшыня беларускага парламента Станіслаў Шушкевіч. — Я здымаю сваю кандыдатуру на карысць таго, — завяршыў свой выступ лідэр Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады, — каго абярэ кангрэс!**

Дэлегаты яго словы сустрэлі працяглымі апладысментамі стоячы. У гэтых авацыях гучала і прызнанне заслуг фактычна першага кіраўніка Рэспублікі Беларусь і надзея на тое, што еднасць у апазіцыйных колах не сталася чарговай пустой дэкларацыяй, а вынікам цяжкой штодзённай працы людзей, якія ахвяравалі не толькі ўласнымі амбіцыямі, але і пераконвалі сваіх прыхільнікаў на сумесныя дзеянні дзеля дасягнення галоўнай мэты — незалежнай дэмакратычнай Беларусі.

— Мы ўсе розныя, — заявіў лідэр камуністаў Сяргей Калякін. — Але ў нас ёсць усе падставы да яднання і разумення адзін аднаго, бо толькі так мы зможам пераадолець праблемы, што стаяць перад намі.

Кангрэс дэмакратычных сіл Беларусі, які адбыўся 1-2 кастрычніка бягучага года, кардынальна адрозніваўся ад падобных мерапрыемстваў у мінулым. Практычна адсутнічалі пампезныя элементы эйфарыі і святочнасці. На тварах дэлегатаў была стомленасць, стрыманасць, і, разам з тым, жаданне рухацца далей. Большасць дэлегатаў кангрэса прайшлі доўгі шлях палітычнай барацьбы. Не сцёрліся з памяці выбары, калі апазіцыя не здолела абраць адзінага. Узгадваліся часы, калі лідэра абралі кулуарна і невядома па якіх крытэрыях…

Гавораць, што дэмакраты здольныя аб’яднацца толькі за пятнаццаць хвілін да расстрэлу. У гэтым ёсць слабасць дэмакратаў, але і сіла, бо калі лідэры разумеюць, што духоўны „расстрэл” нацыі ўжо ідзе і гэта нашмат страшней асабістага пераследу, што калі ставяцца пад пагрозу агульнанацыянальныя каштоўнасці, то застаецца толькі „пятнаццаць хвілін”, каб аб’яднацца і перамагчы разам.

— У мяне ў руках тры святыні: Біблія, Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 года і кніга з творамі Васіля Быкава. Я мару пра той час, калі гэтыя творы стануць настольнымі кнігамі кожнага беларуса, — так заявіў кіраўнік Аб’яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька. І кожны дэлегат кангрэса, чуючы гэтыя словы, разумеў, што хоць мы і розныя, але сапраўды ёсць каштоўнасці, якія аб’ядноўваюць усіх. Каштоўнасці, што даюць нам сілы пераадолець непаразуменні і застацца разам.

Улады ў гэты час праводзілі сваю кампанію. З экранаў беларускага тэлебачання не знікала постаць кіраўніка дзяржавы. Дзяржаўныя тэлевядучыя лічылі сваім „прафесійным абавязкам” здзекліва пасарказнічаць пра апазіцыю. Смакавалі дэманстрацыю „сексуальных меншасцей”, якія нібыта ўпэўненыя ў лаяльным стаўленні да іх з боку дэмакратаў. Паказвалі кінутую ў аднаго з дэмакратычных лідэраў банку смятаны…

Калі шчыра, то ўдзельнікі з’езда былі здзіўлены такім прымітыўным падыходам дзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі. Яны чакалі куды больш моцных правакацый і былі да іх гатовы. І гатовыя да іх у будучым. І гэта іх не спыніць.

— Я буду працаваць у камандзе таго, каго вы абярэце, — звярнуўся да дэлегатаў кангрэса Аляксандр Мілінкевіч, якога вылучала Партыя зялёных і падтрымаў Беларускі народны фронт. — А калі выберуць мяне, то я пайду наперадзе, заклікаючы астатніх за мной. І на плошчу таксама. Я гатовы аддаць усе свае сілы, каб Беларусь была вольнай і моцнай. Мы маем мажлівасць вярнуць Краіне светлую Свабоду.

Першы тур галасавання не зацвердзіў перамогі аднаго з прэтэндэнтаў. Мілінкевіч атрымаў 383 галасы, Лябедзька — 263, Калякін — 152. Другі тур назваў пераможцу. Ім стаў Аляксандр Мілінкевіч. Іншыя прэтэндэнты яго павіншавалі і пацвердзілі ранейшыя дамоўленасці працаваць разам.

— Я лічу сябе не лепшым, а першым сярод роўных, — заявіў адзіны кандыдат ад аб’яднанай апазіцыі Аляксандр Мілінкевіч. — Давайце будзем разам да канца! Жыве Беларусь!

**Віктар Сазонаў**


## Памёр З. Кісель ☞ 2

Яўген Вапа

*У Гродне памёр Дзіма Кісель, мой шматгадовы сябра, а таксама наш ніўскі карэспандэнт. Зміцер Кісель сваім жыццём, сваімі дзеяннямі праявіў сябе сярод тых першых людзей у Беларусі ў палове васьмідзесятых гадоў, якія выступілі супраць камунізму, за незалежнасць...*

## Парадоксы ☞ 2

Мацей Халадоўскі

*Падляшскі ваявода адмяніў рашэнне правага прэзідэнта Беластока, забараняючы пабудову каплічкі рэлігійнага культу ля царквы Святога Духа, якая ўвекавечвала б памардаваных праваслаўных. Прымаючы такія рашэнні беластоцкія ўлады не ўяўляюць сабе паслядоўнасцей, якія выкарыстае беларуская рэжымная прапаганда...*

## Супраць смуроду ☞ 4

Аляксей Мароз

*Жыхары вуліцы Парыева, размалажанай на ўскраіне Белавежскай пушчы, пратэстуюць супраць запланаванай будове непадалёк ад іх сядзібаў Прадпрыемства гаспадаркі адкідамі і, апасаючыся за сваё здароўе, патрабуюць ліквідаваць гарадскую звалку смецця каля іх збудаванняў. Скарга на дзеянні бурмістра Гайнаўкі ў гэтай справе...*



## Здзекаваліся ☞ 9

Аляксандр Вярбіцкі

*Спярша граніцу каля саміх Кусцінцаў устанавілі, а пасля адкінулі кіламетр далей, пад Дубніцу. Саланіннікі пасля вайны жыць нам не давалі. З многіх вёсак людзі павыязджалі, бо гаварылі ім:*

*— My chcieli żeby jedna Polska była, żeby nie było kacapów...*

## Пашанцавала ☞ 10

Генрых Злпадашмянскі

*На разгубленым твары міліцыянта, які глядзеў на ад’язджаючую машыну з наклеенай на багажніку выявай забароненага ўладамі бел-чырвона-белага сцяга, можна было заўважыць, што ён на 99 адсоткаў не паверыў Віктару. Не можа быць, каб адміністрацыя прэзідэнта ездзіла на такой старой машыне ды яшчэ размаўляла па-беларуску. Але раптам...*

## Адпачынак ☞ 11

Міхал Мінцэвіч

*На „Купале” пабольшала таксама пастаянная экспазіцыя конных сельскагаспадарчых машын. Не хапае яшчэ толькі манежа і сячкарні. Для праездак ёсць брычка, а на зіму — конныя сані...*

# Памяці Дзімы Кісяля



*У панядзелак раніцай нечакана прагучала ў нашай рэдакцыі балючая навіна — у Гродне памёр Дзіма Кісель, мой шматгадовы сябра, а таксама наш ніўскі карэспандэнт. Пішу гэтыя словы, а вобразы мінулага мігцяць перад вачыма. Толькі сэрца адзываецца з нейкім болем: колькі яшчэ перад намі зламаных жыццяў, складзеных як ахвяры бязмежнай веры ў незалежную і беларускую Айчыну. Зміцер Кісель сваім жыццём, сваімі дзеяннямі праявіў сябе сярод тых першых людзей у Беларусі ў палове васьмідзесятых гадоў, якія выступілі супраць камунізму, за незалежнасць. У адрозненні ад змагароў вясковага паходжання, паходзіў ён з аўтэнтычнай беларускай інтэлігенцыі. Ягоныя бацька і маці былі настаўнікамі, якія адпакутавалі ў сталінскіх лагерах за раскідванне беларускіх лістовак у пасляваенным Гродне. І гэта вызначыла лёс Дзімы. Ён сваім жыццём і дзейнасцю, здаецца, хацеў даказаць, таксама і перад бацькамі, што дадзенае яму адно жыццё ён пражыве для Беларусі. Калі мы пазнаёміліся ў палове 1980-х, дык адразу пагадзіліся ў адным самым важным. Нягледзячы тады яшчэ на жалезны занавес, мы сцвердзілі, што беларусы Беласточчыны і Гродзеншчыны наканаваны на ўзаемасупрацоўніцтва, дапамогу, сяброўства. Дадзенае тады слова Дзіма стрымаў. Гэта ён убіваў у мазгі савецкім людзям, што ёсць на гэтым свеце беларусы Беласточчыны, пра якіх трэба памятаць. То па ініцыятыве Дзімы ладзіўся першы абмен паміж незалежнымі моладзевымі беларускімі асяродкамі Гродна, Беластока і Варшавы, першае адкрыванне намі Беларусі ў канцы васьмідзесятых з дапамогай светлай памяці прафесара Міхася Ткачова. Кожны, хто з Беласточчыны ехаў у Беларусь цераз Гродна, не мог не абмінуць кватэры Дзімы і ягоных бацькоў. Тое, што было пачутае ў размовах, давала сілу. Смаку соленых агурочкаў гэтага дому таксама ніколі не забыць. Толькі потым мы даведаліся пра ролю гродзенскага, адраджэнскага асяродка, які непадцэнзурна займаўся выдаваннем „Рэанімовы”. Кола людзей звязаных з Данутай Бічэль-Загнетавай, Алесем Чобатам, Дзімай Кісялём вяртала беларускую годнасць саветызаванаму Гродну. Падпольныя выданні, незалежніцкія вечарыны, потым арганізацыйнае мацаванне структур Беларускага народнага фронту надало сэнс жыцця ўсяму пакаленню Дзімы, якое і сёння нясе на сабе цяжар змагання. Шматгадовая, нерэалізаваная мара пра сваю Беларусь прывяла і Дзіму ў магілу. Вельмі часта ставіў я сабе пытанне: калі б усё было нармальна ў Беларусі, у чым мог бы сябе праявіць Дзіма? Ягоны аналітычны погляд гісторыка па адукацыі вызначаў Яму шлях у навуку, палітыку, журналістыку. Ён усё гэта рабіў, але не як чалавек, якога такія здольнасці павaжае і належным чынам ацэньвае свая краіна. Дзяржава Лукашэнкі забрала яму надзею. Без надзеі ён пачаў згараць. Паволі, на нікога не крыўдуючы, рады яшчэ толькі з сустрэч з сябрамі. У апошнія гады прыйшлося мне не раз глядзець на хваробу, якая знішчала майго сябру. Для нас, ягоных блізкіх, была гэта драма. Можа і ёсць частка нашай віны ў тым, што рашуча не змаглі мы Яму дапамагчы. Калі так, прабач нам Дзіма.*

*Дзіма Кісель быў нашым карэспандэнтам у Беларусі. Гэта Ён дасылаў нам інфармацыю, погляд, аналіз пра тое, чым жыве беларускае грамадства. Журналістам быў ён класным. Усё мусіў дакладна праверыць; не любіў пісаць пра пустое. Пісаў пра балючае, беларускае. У гэтым годзе змясціў Ён у нас два свае фельетоны. У апошнім допісе змешчаным у велікодным нумары „Нівы” ад 1 мая 2005 г. ён напісаў: „Некалькі апошніх гадоў мне давялося пажыць на вёсцы, пабыць рынкавым гандляром, беспрацоўным і чорнарабочым. Я пазнаў жыццё розных катэгорый „простых” людзей, чуў ад іх тое, чаго ніколі яны не скажуць ні карэспандэнту газеты, ні партыйнаму актывісту”. Выццё са сваім народам вызначыла Твой лёс. Няхай беларуская зямля будзе Табе пухам.*

**Яўген Вапа**

# Серп і молат



*Кожны народ мае сваю сімволіку. Яна існуе не толькі для таго, каб яе падымалі, калі прадстаўнік дзяржавы выйграе алімпійскія гульні, ці калі дэлегацыя краіны завітае ў госці да суседзяў. І не толькі для таго, каб футбольныя фанаты маглі здалёк убачыць сваіх суайчыннікаў. Сімволіка мае глыбокі духоўны сэнс, які гаворыць пра палітычны і духоўны выбар народа. Кроў Хрыста на белым палотнішчы — так ахарактарызавалі свой нацыянальны сцяг беларусы. Сцяг, які мае даўнюю сувязь з выбарам нашых продкаў, іх светаглядам, і які адразу, пасля скону Савецкага Саюза і набыццём нашай краінай незалежнасці стаў дзяржаўным. Зноў залунаў над Беларуссю, як сведчанне таго, што яе народ будзе працягваць справу былых пакаленняў і поўны рашучасці крочыць наперад разам з сям’ёй еўрапейскіх народаў, беручы лепшае ад іншых, і прыносячы сваё ў скарбонку развіцця зямной цывілізацыі. А імклівая „Пагоня” сцвярджала, што мы гатовыя за гэтую незалежнасць змагацца і адстойваць яе.*

*„Свой” сцяг быў нават у Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, якая ўваходзіла ў склад СССР і мела намінальны „суверэнітэт” толькі для таго, каб СССР здабыў трохі больш галасоў у ААН, ці каб абдурыць сусветную супольнасць, што ў Савецкім Саюзе дбаюць пра развіццё нацыянальных культур. Хоць у самой Беларусі квітнела прапаганда, што адным з найвялікшых здабыткаў развіцця „саюза савецкіх народаў” ёсць знікненне нацыянальных адрозненняў і першая мова, якая павінна дзеля гэтай „вялікай” мэты загінуць, гэта беларуская. Зразумела, што была для ўсіх савецкіх народаў і адзіная сімволіка — чырвоны сцяг з выявай сярпа і молата.*

*Праўда, ужо ў канцы сямідзесятых гадоў гэты сцяг не толькі не меў пашаны, але і стаў аб’ектам насмешак. Пра яго расказвалі анекдоты, што ён нясе небяспеку для ўсіх, хто завітаў у СССР, як тыя чырвоныя сцяжкі, якімі абносяць ямы на дарогах. Спявалі песні кшталту: „Не саромся алкаголік наса ты сваёга, бо ён з нашым сцягам колеру аднога”. Пра серп і молат казалі таксама: „Хочаш жні, а хочаш куй, усё адно дастанеш х...”.*

*Як толькі я прыйшоў з войска, то мяне прывітаў па радыё БССРаўскі гімн: „Мы беларусы, з братняю Руссю...”. Іншыя народы „братэрскага саюза” нашым гімнам не пералічваліся, толькі Русь. Зараз у Расіі няма сярпа і молата на сімволіцы. Але яны засталіся, неафішывана і патаемна, як монстр, які прыцік і чакае свайго часу. Застаўся і ў самой федэрацыі як сведчанне таго, што краінай кіруюць не рускія, а — як і раней — бальшавікі, і ўсюды, дзе сённяшняя Расія мае ўплывы. У Прыднястроўскай рэспубліцы серп і молат знайшоў месца нават на грашах. У Беларусі, маладыя беларускія салдаты носяць на сваіх пражках выяву пяціканцовай савецкай зоркі з сярпом і молатам. Відаць, савецкая імперыя яшчэ не сканала, бо ўсюды, дзе толькі ёсць яе выява, праводзіцца і яе палітыка, пад назвай „назад у СССР”. І так званы „Саюз Беларусі і Расіі”, і „СНД”, і ўсялякага роду „эканамічныя” ўтварэнні на прасторах былога СССР гуртуюцца менавіта на гэтай, саюзнай, сярпаста-малаткастай бальшавіцкай ідэалогіі. І паўсюдна праводзіцца адна і тая ж палітыка — змаганне з нацыянальным.*

*Найбольш яскрава яна праяўляе сябе ў Беларусі. „Двухмоўе”, пры якім амаль зніклі беларускамоўныя школы, прапаганда былога сацыялістычнага ладу жыцця і камуністычнай ідэалогіі, піянерскія гальштукі, камсамольскія святы, новыя „Паўлікі Марозавы”...*

*Таму ў Беларусі змаганне за незалежнасць і еўрапейскі шлях развіцця мае значэнне не толькі для беларусаў. Змаганне за беларускую незалежнасць гэта яшчэ і змаганне з імперыяй, якая руйнавала храмы і знішчала нацыянальную свядомасць, праводзіла „суды” троек і пагражала ўсяму чалавецтву... І хоча зараз набрацца моцы і працягваць гэткую ж палітыку. Таму змаганне за беларускую незалежнасць — гэта яшчэ і змаганне з імперыяй сярпа і молата.*

**Віктар Сазонаў (Гродна)**

**Вачыма еўрапейца**

# Воўк ваўка



*Мабыць, невыпадкова апошняя дэбата і рэзалюцыя Еўрапарламента, якая крытыкуе ўлады Беларусі за парушэнні правоў чалавека, супала з публікацыяй у найбольшай мінскай газеце „Советская Белоруссия” атакуючага Польшчу інтэрв’ю парламентарыя Міколы Чаргінца — старшыні Пастаяннай камісіі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Савета Рэспублікі. Быў ён надрукаваны пад загалоўкам-пагаворкай: „Вол волка слушает, пока кушает”.*

*Еўрадэпутаты, між іншым, асудзілі дэлегалізацыю евангеліцка-рэфармаванага касцёла ды спробу пераняцця кантролю над Саюзам палякаў Беларусі і газетай „Głos znad Niemna”. Еўрапарламент — ужо ў пятай рэзалюцыі ад часу, калі ў ЕП засядаюць палякі — заклікаў падтрымаць дэмакратычна выбраную ўправу СПБ і іншыя няўрадавыя арганізацыі. Асудзіў таксама спіхванне на абочыну праблем ромскай меншасці. Савет Еўропы і Еўракамісія заклікаюцца стварыць праграмы стыпендый і фондаў для няўрадавых арганізацый ды дзеячаў у галіне правоў чалавека і меншасцей. Урэшце еўрадэпутаты падтрымалі намер адправіць у Беларусь спецыяльнага дыпламатычнага прадстаўніка і адкрыць у Мінску пастаяннае прадстаўніцтва ЕС.*

*У адказ на рэзалюцыю камісар па справах пашырэння ад імя Еўракамісіі паінфармаваў, што Камісія падпісала 27 дамоў з няўрадавымі арганізацыямі ў Беларусі вартасцю ў 3 мільёны еўра, а ў кастрычніку размяркуе яшчэ дадатковыя 420 тысяч еўра. Нядаўна таксама Камісія аб’явіла таргі вартасцю ў 2 млн. еўра на вяшчанне радыёперадач па-руску і па-беларуску.*

*У дзень дэбаты ў мінскай „Советской Белоруссии” паказалася інтэрв’ю з Міколам Чаргінцом. Парламентарый расказаў аб сваіх заўвагах наконт выбараў у Польшчы, падзяліўся ўражаннямі з сустрэч з польскімі палітыкамі і дзеячамі. Вось некалькі ўражанняў, кранаючых абсурду або мінаючыхся з праўдай або з праўдай у нацяжку:*

*— У шмат якія выбарчыя пункты ў Варшаве проста не былі ўпушчаны міжнародныя назіральнікі.*

*— Іхныя [бэгэкатоўскія, меншасныя — М. Х.] мерапрыемствы фінансуюцца са спазненнем і няпоўнасцю.*

*— Найстрашнейшае тое, што працягваецца асіміляцыя беларусаў.*

*— Ва ўладах Беластока, дзе кампактна пражываюць беларусы, няма ніводнага чыноўніка беларускай нацыянальнасці.*

*— Беларусаў не прымаюць на працу ў паліцыі і іншых органах дзяржаўнай улады. Ці ж гэта дэмакратыя?*

*У тых сцвярджэннях Мікола Чаргінец спасылаўся на быццам бы думкі Яна Сычэўскага, ад якіх той пазней рашуча адмовіўся, называючы іх маніпуляцыяй.*

*У кантэксце гэтых звышінтэрпрэтацый, а нават маніпуляцый і няпраўды, упісваецца рашэнне падляшскага ваяводы (СЛД), які адмяніў рашэнне правага прэзідэнта Беластока, забараняючы пабудову каплічкі рэлігійнага культу ля царквы Святога Духа, якая ўвекавечвала б памардаваных праваслаўных. Прымаючы такія рашэнні беластоцкія ўлады не ўяўляюць сабе паслядоўнасцей, якія выкарыстае беларуская рэжымная прапаганда. У гэтай справе дэмагогія беларускага парламентарыя мала адрозніваецца ад выказвання віцэ-прэзідэнта Беластока Кшыштафа Савіцкага:*

*— На нашу думку, гэтая капліца нерэлігійная, а звычайны помнік, які можа давесці да чарговага нацыянальна-рэлігійнага канфлікту.*

*Беластоцкі магістрат палітычна набліжаны да еўрадэпутацкіх асяроддзяў, якія запачаткоўваюць чарговыя рэзалюцыі ў справе Беларусі, заявіў ужо, што свайго рашэння ў справе каплічкі не зменіць.*

**Мацей Халадоўскі**

*У пяцідзесятых гадах у Курашаве ўзніклі буйныя сады. Іх заснавальнікамі былі браты Васіль, Уладзімір і Мікола Анішчукі...*

# Умелі жыць з агародаў

**Курашава (Чыжоўская гміна) вядомае ў наваколлі вырошчваннем агародніны і фруктаў. Першыя яблыневыя сады былі заснаваны ў пасляваенныя гады. Крыху пазней сяляне сталі вырошчваць агуркі і памідоры. Сваю прадукцыю прадавалі яны на гайнаўскім рынку і высылалі на экспарт. Цяпер агародніна і фрукты з Курашава прадаюцца на мясцовых рынках.**


Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*Васіль Нікалаюк*

## *Станоўчыя рэзультаты ліквідацыі цераспалосіцы*

Яшчэ ў 1934 годзе ў Курашаве была ліквідавана цераспалосіца і з ліку 183 гаспадароў толькі трэцяя частка асталася жыць у вёсцы. Былі гэта сем'і, якія атрымалі зямлю блізка ад сваіх панадворкаў. Астатнія сяляне пасяліліся каля сваіх палёў.

— Перад камасацыяй былі ў нас вельмі вузкія панадворкі, а зараз здараецца, што ад адной хаты да другой адлегласць складае каля трохсот метраў. Калі знікла цераспалосіца, людзям намнога лягчэй стала гаспадарыць, — кажа солтыс Курашава Васіль Нікалаюк.

Толькі найстарэйшыя жыхары Курашава памятаюць іераманаха Серафіма, які ў міжваенны перыяд змагаўся за захаванне праваслаўя. У перыяд нямецкай акупацыі вёў ён місіянерскую работу на беларускіх землях, а пасля быў арыштаваны савецкімі ўладамі і замучаны. Зараз Серафім занесены ў лік святых мучанікаў Беларускай зямлі. Каля прыхадской царквы ў Курашаве паставлены яму помнік. Жыхары ганарацца тым, што ў іх вёсцы жыў святар, які сваім жыццём і малітвай заслужыў звання святога.

— Айцец Серафім быў выдатным свяшчэннікам і таму ўсе жыхары нашай вёскі ўспамінаюць яго станоўча. Даваў ён прыхаджанам сваё апошняе харчаванне. Памагаў захаваць праваслаўе і абараняў нашу царкву, якую хацелі захапіць уніяты, — гаворыць Васіль Нікалаюк.

## *У пасляваенныя гады*

У Курашаве, так як у іншых вёсках Гайнаўшчыны, у пасляваенны час жылося цяжка.

— Трэба было аддаваць кантынгенты на адбудову краіны. Бывала, што людзям не хапала сваіх сельскагаспадарчых прадуктаў і тады пазычалі іх у іншых, каб толькі выканаць абавязацельствы ў адносінах да дзяржавы, — успамінае Надзея Петручук.

— У нашай вёсцы людзі не апускалі рук і працавалі. Прыязджалі да нас агітатары і заахвочвалі выязджаць на працу на вернутыя землі. Хаця ў Курашаве было крыху беднейшых гаспадароў, ніхто не пакінуў сваю гаспадарку, каб падацца ў невядомае, — кажа Васіль Нікалаюк.

Калгас у Курашаве быў заснаваны ў другой палове пяцідзесятых гадоў і дзейнічаў вельмі коратка.

— У калгас уступілі 18 гаспадароў. Выдзелілі ім самае лепшае ў вёсцы поле. Мусілі сваю зямлю аддаць таксама Васіль і Уладзімір Анішчукі. Іх дом так абаралі, што яны ледзь маглі дабрацца на свой панадворак. У майго бацькі забралі 8 гектараў добрай зямлі і далі за гэта 6 гектараў пяскоў, — тлумачыць солтыс Васіль Нікалаюк.

Супраць рашэнняў чыноўнікаў, якія прызначалі зямлю калгасу, сталі пратэставаць багатыя аднаасобнікі. Сталі яны ездзіць нават у Варшаву і тады ўлады вярнулі ім зямлю, якую яны раней абраблялі.

— Пасля мітусні з зямлёй курашаўцы сталі выступаць з калгаса і ён разліцеўся. Калгаснікі не паспелі нават збудаваць сабе абору і быдла трымалі ў сваіх хлявах. Збожжа да малацьбы ляжала ў стагах. Цяжка было таксама размеркаваць плату за працу ў полі. У бухгалтара згарэлі калгасныя фінансавыя дакументы. Ён тлумачыў, што спаліліся яны ў печцы, дзе захоўваліся, а падпаліла іх маці, якая не ведала аб гэтым тайніку, — гаворыць Васіль Нікалаюк.

## *Пачалі вырошчваць фрукты і агародніну*

У пяцідзесятых гадах у Курашаве ўзніклі буйныя сады. Іх заснавальнікамі былі браты Васіль, Уладзімір і Мікола Анішчукі. Прыгожыя яблыкі прадавалі яны ў Гайнаўцы і навакольных вёсках. Пасля іх садавіну стаў купляць кааператыў у Бельску-Падляшскім, які гандляваў фруктамі, агароднінай і пчалярскімі прадуктамі. У апошнія гады іх дзеці і ўнукі разгарнулі прадукцыю яблык і груш. Зараз сады некаторых гаспадароў займаюць тэрыторыю ў некалькі гектараў. У дзевяностых гадах спынілася арганізаваная скупка яблык, якія прадаваліся на замежных і польскім рынках. Гаспадары вымушаны прадаваць фрукты на мясцовых рынках і прапанаваць іх уласнікам магазінаў.

— Вырошчваць агародніну на продаж пачалі нашы жыхары ўжо пасля вайны. Першым плантацыю капусты завёў Лукаш Ляшук, а з яго ўзялі прыклад іншыя гаспадары, якія прадавалі сваю агародніну на гайнаўскім рынку. У пяцідзесятых гадах жыхары Курашава сталі масава вырошчваць агуркі на экспарт, — успамінае Васіль Нікалаюк.

Вядомымі пастаўшчыкамі агуркоў сталі Язэп Паўлючук, Ян Янцэвіч, Ян Янчук і Мікола Артэмюк, а іх гародніна прадавалася ў Германіі і Чэхаславакіі. Крыху пазней курашаўскія агароднікі сталі вырошчваць памідоры. Пачынальнікамі ў гэтай галіне былі Міхал і Антон Дзмітрукі.


Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*У Курашаве многа прыгожых дамоў, збудаваных яшчэ перад гаспадарчымі і грамадскімі пераменамі*

— У пачатку шасцідзесятых гадоў мы з мужам пачалі вырошчваць агуркі на полі, а пасля ўзяліся за памідоры. Бывала, што расло ў нас па пяць тысяч корчыкаў памідораў. Трэба было іх пасля вазіць на гайнаўскі рынак і прадаваць. Калі мы распачыналі вырошчванне агуркоў, былі яны вялікімі і прадаваліся на штукі. Адразу збіралі мы іх у воз з застаўкамі і вазілі на рынак, — кажа Надзея Петручук. — Дадаткова мы сталі гадаваць свіней. Бывала, што прадавалі за год больш за 20 штук.

— Калі яшчэ ў нашу вёску не была даведзена электрычнасць, мы купілі млынок з рухавіком унутранага згарання для памолу мяшанкі (асыпкі), якую вазілі на продаж. Бывала, што амаль усё збожжа перамалолі і пасля прадалі на гайнаўскім рынку. Тады свіней гадавалі жыхары Гайнаўкі і Белавежы і яны былі галоўнымі пакупнікамі мяшанкі. Прыбытак ад продажу асыпкі быў большы, чым ад продажу збожжа, але трэба было многа каля гэтага напрацавацца, — гаворыць Пётр Петручук. — За грошы выручаныя ад продажу памідораў, агуркоў і асыпкі мы збудавалі дом і ўсе гаспадарчыя будынкі.

## *Мадэрнізацыя вытворчасці*

Браты Дзмітрукі пасля сталі ў Курашаве пачынальнікамі вырошчвання агародніны пад плёнкай, што намнога паскорыла працэс яе даспявання. Прыклад з іх пачалі браць іншыя гаспадары і ўжо ў самым пачатку лета прадавалі памідоры на навакольных рынках.

— Быў такі перыяд, што ў Курашаве вырошчвалі шмат памідораў. Нават арганізавалі ў вёсцы іх скупку, — успамінае спадар Нікалаюк. — Яшчэ ў васьмідзесятых гадах нашым гаспадарам добра жылося. Мы вядомыя былі таксама як пастаўшчыкі капусты. У дзевяностых гадах упалі цэны і запатрабаванне на памідоры. Зараз дарагія машыны і сродкі прадукцыі агародніны і таму многа гаспадароў скарацілі яе вытворчасць.

Многія гаспадары Курашава будавалі дамы, гаспадарчыя будынкі і разгарнулі сельскагаспадарчую вытворчасць у 1960-1980 гадах.

— Зараз не відаць перспектывы для прадукцыі збожжа, якой займалася шмат гаспадароў Курашава. Многа маладых выехала ў гарады і дамы іх бацькоў пустуюць. У вёсцы засталося можа пад трыццаць гаспадароў, з ліку якіх толькі частку састаўляюць маладыя земляробы, — кажа солтыс.

Жыхары Курашава задаволены, што будзе мадэрнізавацца дарога з іх вёскі ў суседнія Ляды.

— Чыжоўская гміна бедная і мала сродкаў астаецца на інвестыцыі. Аднак войт Юрый Васілюк намагаецца рамантаваць дарогі, — заяўляе Васіль Нікалаюк. — За апошнія гады завяршылі асфальтаваць гмінную дарогу з Курашава ў Лушчы. Хутка будуць мадэрнізаваць — таксама з удзелам гмінных сродкаў — павятовую дарогу ў Ляды.

**Аляксей Мароз**

## Адукацыя і культура

Гэтыя дзве якасці не заўсёды ходзяць разам, хаця многія лічаць, што высокаадукаваны і высокакультурны чалавек, ад якога не пачуць брыдкага слова. Магчыма, што яно так часта бывае, але не заўсёды. Ведаю аднаго інжынера (хто яму даў гэтае званне?), які не лічыцца з нормамі прыстойнасці і абазве чалавека такімі словамі, што ў галаве не месціцца. Што гэта за чалавек? А такіх ёсць і больш, што калі не лаюцца, то іншае свінства ўчыняць чалавеку. Такіх людзей трэба асцерагацца без аглядкі на іх веды. Ёсць добрая народная пагаворка: „З якой лысінай цяля нарадзілася, з такой і здохне”. І вывад з гэтага ясны: калі чалавек разумны, дык яму і веды спатрэбяцца для росту культурнасці, каб мог быць прыкладам і ўзорам іншым. А калі дурань і ў галаве яго адны чорныя думкі, дык такому ніякая адукацыя не паможа стаць культурным чалавекам. Такі зможа толькі штучна і коратка прыкідвацца „культурным і гуманным”, але гэта ўсё танны тэатр. Мо таму і сярод тых, што зверху намі правяць, знаходзяцца і такія чорныя авечкі, і лютыя ваўкі.

Ёсць людзі з невялікай адукацыяй, але іх культура і гуманнасць на высокім узроўні. У іх званне неабавязковае, але ад іх можна павучыцца.

**Мікалай Панфілюк**

## У Грушках...

... заснавалі Прыродазнаўча-лясны пакой у тамашнім Надлясніцтве „Броўск”. Вядзе яго падляснічы Уршуля Алейніцкая. Знаёміць яна наведвальнікаў з працай леснікоў і багатымі архіўнымі матэрыяламі — памятнымі фотаздымкамі, дакументамі, ілюстрацыямі — паказваючымі гісторыю Белавежскай пушчы ды дзяржаўных лясоў, а таксама людзей, якія ярка ўпісаліся ў гісторыю пушчы. На пастаянных выстаўках знаходзяцца падоўжныя і папярочныя разрэзы дрэў, калоды дрэў з карой розных парод.

Каля офіса Надлясніцтва „Броўск” у Грушках леснікі стварылі г.зв. гербарый. На яго тэрыторыі знаходзіцца алея з дрэўцамі цікавых, рэдкіх у нас парод, растуць лясныя, палявыя і скальныя расліны. Перасякае гербарый ручай, ад якога бягуць сцяжынкі. Цераз ручай пабудавалі кладачкі і мосцік. Тут стаіць панарамная вышка, з якой можна глядзець шырокую маляўнічую ваколіцу. **(мох)**

## Сцёртыя палосы

Зараз ужо мала прыкметныя белыя палосы, г.зв. зебры, на пераходах для пешых нават на галоўных вуліцах у Гайнаўцы, між іншым, на вул. Беластоцкай, Белавежскай, Баторыя, Пілсудскага і Арміі Краёвай. Яны найбольш белыя і бачныя на вуліцах Ліпавай, 3 Мая, Рэя, А. Зіна і І. Верабея ды пры плошчах з кругавым рухам у цэнтры горада. **(мох)**

# Пратэст супраць смуроду



*Адам Мончка і Зофія Мончка (справа) лічаць, што з суседзямі многа нацярпеліся ад звалкі*

**Жыхары вуліцы Парыева, размешчанай на ўскраіне Белавежскай пушчы, пратэстуюць супраць запланаванай будове непадалёк ад іх сядзібаў Прадпрыемства гаспадаркі адкідамі і, апасаючыся за сваё здароўе, патрабуюць ліквідаваць гарадскую звалку смецця каля іх збудаванняў. Скарга на дзеянні бурмістра Гайнаўкі ў гэтай справе, накіраваная ў Падляшскую ваяводскую ўправу ў Беластоку, была перададзена на разгляд у Гарадскую раду. На сесію Рады горада Гайнаўкі 28 верасня прыйшлі са сваімі аргументамі прадстаўнікі пратэстуючых жыхароў.**

— Ужо дваццаць гадоў таму нашы бацькі намагаліся ліквідаваць гарадскую звалку смецця, пратэставалі, але гарадскія ўлады іх ігнаравалі. Мы заклікаем знайсці новае месца для будовы прадпрыемства гаспадаркі адкідамі і патрабуем прывесці ў парадак месца сённяшняй звалкі. Трэба было б выбраць усё смецце і адкіды закапаныя ў зямлі да 7 метраў углыб. Мы хочам, каб забралі закапаныя там азбест, акумулятары, свінец, якія разам з іншымі адкідамі могуць стаць экалагічнай бомбай, якую заражаем, — заявіў хвалюючым голасам Адам Мончка, жыхар вуліцы Парыева. — Мы не хочам звалкі каля жылых дамоў і запаведніка птушак.

Гайнаўская звалка смецця была адкрыта на месцы гравійнага кар’ера ў 1968 годзе. Зараз яна не адпавядае нормам складавання адкідаў.

— Цяпер са звалкі распаўзаюцца чарвякі, шматлікія насякомыя, нясецца смурод. З-за таго агратурыстычныя кватэры вымушаны спыняць сваю дзейнасць. Пакутуюць ад гэтага таксама нашы суседзі з вясковай Гайнаўскай гміны, — гаварыў Адам Мончка.

Прадстаўнікі скаржнікаў прасілі бурмістра і гайнаўскіх радных, каб прадпрыемства сартавання адкідаў і сіласы для ліквідацыі арганічных адходаў былі збудаваны ў іншых месцах, больш аддаленых ад жылых дамоў.

— Наш пратэст падтрымала 59 асоб, жыхароў вуліцы Парыева і вясковай Гайнаўскай гміны. Калі вее вецер, то смурод адчуваюць толькі жыхары на другім баку звалкі. Калі няма ветру, агідны пах разыходзіцца навокал і даходзіць да ўсіх дамоў распаложаных непадалёк ад складаваных адкідаў, — сказала пратэстуючая жанчына.

Бурмістр Анатоль Ахрыцюк паспрабаваў пераканаць скаржнікаў, што будова прадпрыемства сартавання адкідаў не будзе шкоднай для навакольных жыхароў.



*Зараз смецце з Гайнаўкі складваецца ў адвалах*

— Вашы пратэсты сталі агучвацца, калі завяршаюцца праекты ліквідацыі звалкі смецця, — заявіў бурмістр Ахрыцюк. — Прадбачваем выбраць усе адкіды і пасартаваць іх у новазбудаваным прадпрыемстве гаспадаркі адкідамі. Тое, што будзе падыходзіць да ліквідацыі ў сіласах, будзе ў іх памешчанае. Рэчывы, якія можна утылізаваць, будзем прадаваць, а адкіды, якія нельга будзе перарабіць плануем вывозіць на вялікую супольную звалку для Гайнаўскага, Бельскага і Сямятыцкага паветаў. Пасля будзе праведзена рэкультывацыя зямлі з-пад звалкі.

Бурмістр Анатоль Ахрыцюк паінфармаваў, што ўжо завяршаецца стваранне камунальнага саюза гмін трох згаданых паветаў. Плануецца будаваць, з выкарыстаннем еўрасаюзных сродкаў, у Гайнаўцы, Бельску-Падляшскім і Сямятычах або побач гэтых гарадоў прадпрыемствы гаспадаркі адкідамі, у якіх будуць сартавальні смецця. Побач іх будуць узведзены сіласы для арганічных адкідаў з мэтай іх ліквідацыі. Усе непрыгодныя для утылізацыі адкіды будуць перавозіцца на цэнтральную звалку смецця, створаную для ўсіх гмін трох паветаў. Такая звалка будзе побач вёскі Дубяжын.

— На будову цэнтральнай звалкі выдзелена 70 гектараў зямлі з фонду Сельскагаспадарчага агенцтва дзяржаўнага скарбу. Жыхары Дубяжына далі ўжо згоду на будову звалкі, — паінфармаваў бурмістр. Стаў ён пераконваць пратэстуючых, што для ліквідацыі небяспечнай для асяроддзя звалкі трэба збудаваць прадпрыемства па сартаванню адкідаў і герметычны сілас, каб не разносіўся непрыемны пах.

— Мяркуем, што праблема гаспадаркі адкідамі будзе вырашана на працягу 4-5 гадоў. У горадзе няма іншых месцаў для сартавання адкідаў і будовы сіласа, — тлумачыў бурмістр Ахрыцюк. Сказаў ён, што прапанаванае месца распаложанае ў напрамку вёскі Хітрая, ужо даўно прададзенае Паўночна-Падляшскаму таварыству аховы птушак, а ў вясковай Гайнаўскай гміне няма ўчасткаў, якія можна было б прызначыць на будову сартавальнага прадпрыемства.

Раней справа пратэсту жыхароў вуліцы Парыева разглядалася гайнаўскімі раднымі на камісіях, якія, дзеля ліквідавацыі праблем са старой звалкай, запрапанавалі пабудаваць побач яе сілас і новую сартавальню. Цяпер прапанавалі яны адхіліць скаргу на дзейнасць бурмістра Анатоля Ахрыцюка. Радныя 12 галасамі за і 4 супраць (апошнія радныя ўстрымаліся ад галасавання) прынялі пастанову, якая скаргу жыхароў вуліцы Парыева лічыць беспадстаўнай і аднachасова забавязалі бурмістра пільна наглядаць за правільным выкарыстаннем звалкі. Зофія Мончка не скрывала свайго незадавальнення рашэннем гайнаўскіх радных.

— Пастанову гайнаўскіх радных будзем абскарджваць у вышэйшых інстанцыях. А з бурмістрам спаткаемся ў большым коле і будзем пераконваць яго да нашых пастулатаў, — заявіла пасля галасавання радных Зофія Мончка.

**Аляксей Мароз**

# Цыганскае сонца Карпатыі

**Ліст з Цячава!**
**— 9 —**

Любы дружа!

Ці ўсё думаеш здымаць каўбойскі фільм? Калі так, заглянь у Цячаў. Тут ёсць усё што табе трэба, маю на думцы табуны коней, востры перац і мора цыганоў, якіх можна пераапрануць за індзейцаў. Я, вядома, бачу і для сябе ролю індзейкі-шаманкі, якая харчуецца супам з мухамораў. Бо апрача перцу тут спажываюць процьму грыбоў і бэтак, якія ў нас лічацца неядомымі. Горш з рыбай — увогуле асцерагайся з рыбай, у мястэчку на пяць кіламетраў пахне мафіяй.

Пытаеш пра адрас брата Дам'яна? Забі — не скажу! Францысканец прапаў як вадой змыла. Ужо з самога рання мы шукалі яго сярод манахаў-славакаў, але тыя толькі паціскалі плячыма. Каб не ягоная мінералка, падумалі б — з'ява якая. Касцёл, якім апякуецца місія, пад патранатам святога Лукі (з валом). Францысканцы запрашалі нас на каву, але мы ласкава адмовіліся. Уцякалі перад спякотай. Жар ліўся ўжо ад світання, як на пустыні. Смешна было мыцца вадой проста з калодзежа, сцэна напаміналa часы дзяцінства. Так мыліся ў Н. дзядзькі ў жніво, ля калодзежа, якіх проста з вядра палівалі сцюдзёнай вадой.

У Цячаў папалі мы выпадкова, якраз там невыносна захацелася ў туалет. Сама вандроўка напаміналa фільм з-пад знака „Фабрыкі" — восем гадзін маруднай язды маршруткай. Шлях ішоў паўз раку Цісу і я ўяўляла, што плыву на гуцульскім плыце. Наша маршрутка крыху напаміналa дыліжанс. Хоць не, хутчэй печку, на якой перамяшчаюцца героі-дурачкі ў славянскіх казках. У сярэдзіне пахла ўсім — паток поту заліваў твар і валасы. Жанчыны, якія ехалі разам, не дазвалялі адкрыць акна. „Прадуе!" — крычалі.

Пытаеш пра горы Карпаты — гэта ідэальны фон для тваіх фільмаў. Ля румынскай граніцы дарогі ўюцца як серпанцін, даліны напамінаюць Вялікі Каньён. Многа тут вадаспадаў і арлоў, якія шыбуюць у вяршыні. Хоць колеры тут іншыя, дамінуе зялёны і... чырвоны. Першы, гэта колер лесу, які парастае горы. Чырвоны — любімы колер гуцулаў. Тут ля дарог пабачыш яшчэ чырвоныя гурбы памідораў, якіх прадаюць сяляне. Словам — усё тут ёсць для тваіх праектаў і кадраў. Вецер ад Чарнагоры навявае смелыя думкі.

* * *

Хто найбольш падыходзіць да ролі сучаснага каўбоя? Мабыць, карпацкія шафёры. У іх жэстах найбольш рашучасці і ініцыятывы. Нагогул, гуцульска-венгерскі мужчынскі род тут нейкі кволы, заспаны. Быццам пад прыгнётам мацеркі, жонкі, дачкі... Глядзіш на іх і думаеш адно: „Дзе ж падзеліся тыя ўсе казакі і разбойнікі Янічкі, пра якіх спяваюць у песнях?"

Адны шафёры маршрутак (мікраўтобусаў) трымаюць моцна лейцы ў руках. Нягледзячы на сціск і пякельную жару, падбяруць з дарогі кожнага пасажыра, нават калі ўсярэдзіне няма ўжо ні міліметра. У такі сціск загрузяць групу турыстаў з рукзакамі пад неба. Толькі тут чалавек адчувае блізкасць са сваім гатункам.



Шлях ішоў паўз раку Цісу і я ўяўляла, што плыву на гуцульскім плыце

Праўда, трэба памятаць пра адну дэталь: нельга купляць білетаў у касе. Грошы ідуць з рукі ў руку, няма тут ніякіх білетаў, фіскальных касаў ды браніравання. Уявіце сабе такую сітуацыю: купляем у касе білеты, паказваем іх шафёру, а той замест паказаць месца, лаецца матам. Аплявуха ідзе ўбок касіршы.

— Што яна мне тут, б..., прадае?!

Бок кіроўцы трымаюць усе пасажыры, падтакваюць, зласловяць з пагардай на бедную касіршу.

А трэба табе ведаць, што першая і апошняя тэма ў маршрутцы гэта... карупцыя і зладзействы:

— Няма ўжо нашай Украіны, — наракаюць старыя і маладыя, — раскралі яе, прадалі яе бедную...

Найгаласней, вядома, наракае шафёр.

* * *

Цячаў, па-венгерску Técso, распаложаны на правым баку Цісы, на мяжы з Румыніяй, хоць тут гуцульска-венгерскі этнічны сутык. Па вуліцах мястэчка ганяюцца джыпы і фурманкі. У цэнтры мы сустрэлі тысячы цыганоў.

У першым бары, куды зайшлі мы паабедаць, не было ні перцу, ні памідораў. Сярод блакітных столікаў і крыштальных жырандоляў, гасцявала кампанія жыўцом выкадраваная з фільмаў пра мафію. Афіцыянткі з ходу адправілі нас да канкурэнцыі. Каб туды патрапіць, трэба перабрысці ўсё мястэчка. Цэнтр горада цягнецца нейкіх метраў дзвесце, далей пачынаецца свет як з даваеннай паштоўкі. Драўляныя домікі, панадворкі з курамі і індыкамі, процьма дзяцей, пах гародніны і хляўка.

Апошні бар яшчэ больш спрыяў размовам пра інтарэсы, сталы стаялі ў зацішных альтанках-бяседках. За рэстаранам шумела поле абсеянае кукурузай. Там хадзілі за сваёй патрэбай аматары піва.

Калі маладзенькая афіцыянтка паднесла нам рахунак, я пашкадавала, што ў мяне няма рэвальвера. За салат з аднаго памідора і рыбіну патрабавала амаль дваццаць долараў. Мы не мелі шанцу на абарону. З суседняга століка сачылі за намі асобені ў цёмных акулярах. Каля нашай бяседкі бегалі бяздомныя сабакі з рыбінымі галовамі ў зубах. Наколькі не было тут кнігі спажыўца, мы пакінулі прарочы вершык. Апошні радок вяшчаў, што фірма абанкруціцца, а барменачка страціць працу. Пажаданне мы аздобілі выявай маланкі!

Таму, любы дружа, памятай пра маю ролю шаманкі. У мяне яшчэ маленькая просьба: нашы кошты ў Цячаве занясі ў бюджэт свайго фільма.

**Тэкст і фота Евы Сцепанюк**



Апрача перцу тут спажываюць процьму грыбоў і бэтак, якія ў нас лічацца неядомымі

## *Прыгожы лес*

Лядская пушча знаходзіцца з паўночнага боку Белавежскай пушчы. Цяпер ужо не ўжываюць гэтай назвы. Але я ў сваім 60-гадовым узросце яе часта ўспамінаю. Яе акружаюць вёскі Ляўкова, Ахрымы, Капітаншчына (з усходняга боку) ды Крыніца, Барысаўка, Гарадзіска, Падбаравіска, Ваські (з заходняга). Перасякае яе шмат дарог.

Цікавы тут нізінны лес. Растуць у ім дубы-волаты, ясені, вольхі і бярозы, а іх перавышаюць звыш 30-метровыя спічастыя стройныя елкі! Апрача гэтых відаў дрэў маецца тут клён, вяз і ліпа, якая дасягае імпазантных размераў. Растуць тут і сасна-вэймутка, і піхта звычайная, і лістоўніца, і явар, і бук. Ёсць у гэтай пушчы запаведнік „Даліна Вялічкаўкі", у якім водзяцца бабры.

На гэтай тэрыторыі дзейнічае Лясніцтва Крыніца (яно падлягае Надлясніцтву Броўск). Ды вось там на абочынах дарог пакідаюць смецце. Каб колішняя Лядская пушча была чыстая, дбаюць пра гэта ляснічы Андрэй Мядзведзь ды падляснічыя Раман Несцярук і Веслаў Койла. **(мох)**

## *Новае ў Гайнаўцы*

Недзе ад 2000 года ў Гайнаўцы асфальтавалі 44 вуліцы даўжынёю ў 13 кіламетраў. Паклалі асфальт на вуліцах Спартовай, Беластоцкай, Белавежскай, Пілсудскага, Варшаўскай, Ліпавай, Доўгай, выканалі новыя скрыжаванні па вуліцы 3 Мая. Перабудавалі многія тратуары, між іншым, вакол царкоўнай плошчы каля Свята-Троіцкага сабора.

Сёлета ўжо закончылі асфальтаваць Электрычную і Збажовую вуліцы ў раёне Пашкі ды вул. Бакавую ў цэнтры горада. Зараз пачалі пабудову цалкам новай вуліцы — вул. Ракавецкага, якая спалучыць вул. Арміі Краёвай з Ліпавай каля новай бальніцы. Яна будзе праходзіць ускраінай горада з раёна Лясных вузкакалейных чыгунак у раён Ліпавай і ў напрамку прыгарадской вёскі Ліпіны. **(мох)**

## *Пакуль не позна*

Маю тут на думцы таго Аляксандра Баршчэўскага, паэта з Бандароў, пра якога я нават не ведаў, а якога прыгожа прыгадала нам у 35-м нумары „Нівы" Міра Лукша. Вось ён з жонкай — людзі ўжо пажылыя, хворыя. І ёсць пагроза, што напісаныя і нідзе не публікаваныя паэтам вершы могуць загінуць. Варта, каб пра іх паклапаціўся нехта з „Нівы", сабраў і прывёз у рэдакцыю, а пасля... каб іх выдаць у кніжнай форме.

**Мікалай Панфілюк**

*Спадарству*
***Анастасіі і Канстанціну Майсеням***
*словы шчырага спачування*
*з прычыны напаткаўшага Іх гора*
***— смерці Бацькі і Цесця —***
*выказваюць сябры*
*з Беларускага музея ў Гайнаўцы*
*і Беларускага грамадска-культурнага таварыства.*



Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка
для дзяцей і моладзі



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

# Нам сем гадоў...

— *І ўсе мы вясёлыя,* — спяваюць першакласнікі разам з настаўніцай Алінай Ваўранюк. Словы песні адносяцца і да нашых сяброў з Беластока. У класе дзевяць вясёлых хлопчыкаў і восем сімпатычных дзяўчынак, разам сямнаццаць дзетак. Сёння першая сустрэча з „Зоркай”.

— Я ведаю беларускія літары, — заяўляе Аня Аляксейчык. Аня — выпускніца беларускага садка.

— І я ведаю, — кажа Магда Бабік.

— І я, і я, — дадае Юстына Апольская.

„Зорка” таксама ведае гэтыя дзяўчынкі, пра іх мы пісалі пры нагодзе дэкламатарскіх, тэатральных і песенных конкурсаў. Большасць дзяцей у групе — выпускнікі беларускага садка.

— Дайшлі таксама новыя, — адзначае настаўніца:

— На пачатку яны прасілі, каб тлумачыць ім на польскую мову, а зараз яны разумеюць, — хваліць пачаткоўцаў спадарыня Аліна.

— А мой тата таксама не ведаў па-беларсуку, — уключаецца дзяўчынка са светлымі коскамі, — але ўжо крышку навучыўся ад мяне...

Сапраўды так бывае ў Беластоку, некаторыя бацькі не вывучалі мовы ні ў школе, ні ў хаце, а зараз пазнаюць яе разам са сваімі дзеткамі.

* * *

У класе пахне яшчэ канікуламі. На сцяне вісіць насценная газета са здымкамі з беларускага летніка ў Сацах. Тут жа і сцяг беластоцкіх навучэнцаў: васьмікаңцовая зорка. Сцяг дапамагалі ткаць удзельнікі летніка.

Яшчэ прыгажэйшыя вышыванкі і саламяныя аздобы, якія красуюцца на свежа памаляванай сцяне. Пасля канікулаў дзеці атрымалі большую залу, хоць не пераходзілі з месца. Да старой залы далучылі яшчэ адзін клас, прабілі сцяну і зараз тут прасторна. Можна нават весці ўрокі танца.

Першы клас самы вялікі ў навейшай гісторыі Беластока.

— Мы былі вымушаны дакупіць яшчэ сталы і крэслы, — адзначае з радасцю настаўніца.

У ПШ н-р 4 разам ва ўсіх класах 59 навучэнцаў беларускай мовы. Многія з іх захапіліся падарожжам у Беларусь, на школьным стэндзе красуюцца здымкі з Мінска і Полацка.

У Дзень настаўніка школьнікі і бацькі збіраюцца на экскурсію ў Вільню.

* * *

Сёння на ўроках дзеці знаёміліся з часткамі чалавечага цела. Дзеці падзяліся на групы. Іх задачай было злажыць з паасобных частак дзяўчыну і хлопца. Часткі — ногі, рукі, галава і нават акуляры — гэта формачкі з губкі. Мокрую формачку трэба яшчэ намачыць у фарбу, а пасля адбіць на паперы. Чым больш колераў, тым чалавечак прыгажэйшы.

Пасля працы адбываецца супольнае прыбіранне.

Каб замацаваць веды, дзеці навучыліся яшчэ вершык пра часткі цела: *Гэта вочкі, гэта шчочкі...*

Ужо з першага ўрока старанна вывучаюць вершыкі, песні ведаюць...

На пытанні настаўніцы дзеці ўспаміналі беларускія словы. Мне нават удалося падслухаць спрэчку дзяўчынак на перапынку:

— А мой бацька ездзіць у Варшаву на працу, — даказвала першая.

— А мой — і ў Варшаву, і ў Мінск, — перабіла другая.

Трэцяя маўчала, а пасля нечакана заявіла:

— А мой не ездзіць, бо яго скарб у хаце!

Мова, вядома, пра мудрую дачушку.

**Зорка**



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК



Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

# Цецярук

Якая птушка на начлег закопваецца ў снег? — пытаўся ў мяне мой дзедка. — Вядома, калі не начуе на дрэве? — цецярук, з сям'і цецеруковых атрада курападобных. Вядомы ён у лясах і стэпах Еўразіі. У нас звычайна аселы від. Жыве ў мяшаных, лісцевых і хваёвых лясах, часцей з прымессю бярозы і асіны. Часта трымаецца высечак, рэдкага лесу, узлескаў. Корміцца пупышкамі, парасткамі і насеннем дрэў, ягадамі, збожжам, а птушаняты — жывёльным кормам. Самец адрозніваецца выглядам ад самак, меншых па памерах. Самец важыць да паўтара кілаграма, даўжыня яго цела да 40 см. Апярэнне самцоў чорнае з сінявата-фіялетавым адценнем. Брыво чырвонае неаперанае, асабліва выразнае ў шлюбны перыяд. На крыле белая палоска. Хвост лірападобны, падхвосце белае, а самкі шэрыя, стракатыя. Цецерукі палігамныя. У шлюбны перыяд збіраецца 10-15 самцоў (радзей нават 40!), такуюць ад канца сакавіка да чэрвеня (найбольш інтэнсіўна ў красавіку). Самцы *бармочуць* ды *чуфыркаюць*, бегаюць і б'юцца, распусціўшы хвасты. Сям'ёй займаецца выключна самка — закладвае гняздо, зносіць яйкі і выводзіць ды выхоўвае дзяцей. Гняздо — ямка ў глебе, высланае сухім лісцем, галінкамі, іглiцай, добра замаскіраванае галінамі і травастоем. Кладка з 5-13 белых з карычневымі плямамі яек, крыху меншых за курыныя, у канцы красавіка — пачатку мая. Адно яйка зносіць цяцерка аж да 36 гадзін. Вылупліваюцца птушаняты праз 25 сутак. Цецераняты пачынаюць лятаць ужо праз 10 дзён. З канца верасня збіраюцца ў чароды.




Цяжкі цецярук вельмі спраўна скача з галіны на галіну, часам нават, здавалася б, тонкую. На зямлі бегае хутка, але пазбягае адкрытай тэрыторыі. Умее ўзляцець нават з густога кустоўя. Больш лятае восенню, патрапіць пераляцець без адпачынку некалькі кіламетраў, высока, з хуткасцю каля 100 кіламетраў у гадзіну. Чалавека не падпусціць бліжэй чым 100 метраў, а слых і зрок у цецерука знакаміты. Зімой, пры тэмпературы ніжэй 20 градусаў сядзіць ён у снежнай каморцы, раніцай вылятае на корм на верхавіны дрэў.

Вядомы цецярук як герой казак. Завуць яго найчасцей Цярэнцій.

**Міра Лукша**




*Хлопцы з ПШ № 3 у Бельску-Падляшскім*

# Тры Паўліны і Паўл

Як назло, сёння на абед падалі галубцы. Паўл адсунуў талерку з агідай. У вушах яшчэ дуднеў насмешлівы выклік Дубалі:

— А ну, падыдзі да мяне, галубчык!

Паўл ведаў, што сёння зарабіў першую адзінку. Гэта была яго першая ацэнка ў новым годзе.

Наш гімназіст не меў ахвоты думаць пра нішто ў свеце, ён нават не прыкмеціў, як побач прысела Паўліна Ш.




*Дзяўчаты з Чыжоў*

— *Тэсць*! — прывіталася яна іх сакрэтным лозунгам-прывітаннем, якое цягнулася за імі ад часоў прадшколля.

— *Тэсць-тэсць*! — адбуркнуўся гімназіст.

Паўліна Ш. адчакала хвіліну, а пасля ціха захіхікала:

— А што, яда не пайшла?

— Трымаю фігуру, — адпаліў Паўл.

— Так? — не адставала сяброўка. — Яшчэ анарэктыкам станеш. Усе дзяўчаты плакаць будуць...

Паўл ужо хацеў сказаць штосьці непрыстойнае, але ў апошні момант прыкусіў язык:

— Ха-ха-ха! Вельмі смешнае!

Паўліна Ш. зноў адчакала хвілінку... Яна ведала, як дапячы нявернаму.

— Тады сапраўды будуць патрэбныя дзве дзяўчыны. Як самлееш, будуць трымаць пад рукі...

Паўл пачырванеў як бурак. Ён зірнуў на суседнія столікі і яшчэ больш збянтэжыўся. Тры сталы далей сядзелі яго дзве сімпатыі — Паўліна Ц. і Паўліна Б.

Паўл падумаў, што гэта, не інакш — змова. Бабская змова! І ён зноў прыгадаў старую праўду: няма большага ворага ў свеце як дзяўчына!

— Ты добра сябе адчуваеш? — пацікавілася Паўліна Ш.

Паўл маўчаў. Пасля падняўся з месца і грымнуў талеркай аб падлогу. Ягоныя галубцы разляцеліся па суседніх століках.

— А кажуць, што толькі ў дзяўчат праблемы з гармонамі! — працягвала Паўліна Ш. — Ці, можа, марыш, каб перакінуцца ў дзяўчынскую скуру? Не дарма кажуць: *Каля каго патрэшся, ад таго і набярэшся!*

— Сціхні! — крыкнуў на ўсю сталовую Паўл.

*(працяг будзе)*

**Арабінка**

## *Вершы Віктара Шведа*

### *У лекара*

*— Хворы ты, мой мілы дружа, —*
*Адазваўся лекар. —*
*Прыпішу табе я вугаль,*
*Нельга жыць без лекаў.*

*— Вугалю мы не жадаем,*
*Запярэчыў Ваня. —*
*Электрычнае мы маем*
*У хаце аграванне.*

### *Будучы час*

*Настаўніца белмовы*
*Просіць на ўроку дзяцей:*
*— Час будучы дзеяслова*
*Утварыце ад слова „крадзе”.*

*— Па-мойму, — азвалася Бася, —*
*Можна так зразумець,*
*Што гэта ў будучым часе*
*Павінна быць „будзе сядзець”.*

## Польска-беларуская крыжаванка № 41

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку”. Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| ▶ | | Marzenie | ▼ | Gwar / Błyskawica | ▼ ▶ | | ▼ |
| Jar | Morze | ▶ ▼ | | | | Mgnienie | |
| Samolot | ▶ | | | | | | |
| 📖 | Rosa | ▶ | | | | Gatunek | |
| Banan | ▶ ▼ | | | | | 📖 | |
| Park wodny | | Byk | 📖 | 📖 | | 📖 | |
| ▶ | | | | | | | |

Адказ на крыжаванку № 37: Кажан, пах, вінаград, вада, цырк, міска, ваяр, каза. Кава, ідэя, Жана, ногці, рыс, парка, адказ, ах.

*Была тут духоўная семінарыя, у якой м.інш. навучаў Пётр Крэчэўскі — быдучы старшыня Рады БНР. А вучыўся ў ёй вядомы чытачам „Нівы” а. Уладзімір Гарустовіч, аўтар м.інш. бежанскіх успамінаў...*

# Веліч былога горада Ялоўкі

**Перад Шымкамі аўтобус, што едзе з Беластока ў Ялоўку, пavарочвае ў Лявоневічы. У вёсцы на аўтобус сядае пасажырка, інфармуючы, што толькі вось вывелі пакойніка. Значыць, занялі дарогу, па якой павінен быў ехаць далей аўтобус; вяртаемся да шашы той дарогай, якой і прыехалі.**

У Шымках на аўтобус сядае васьмёра пасажыраў, у паловы з іх першая група інваліднасці; напраўляюцца ў касцёл. У Залешанах дасядаецца яшчэ роўна дваццаць пасажыраў — амаль усе з першай групай інваліднасці...

З Залешан у Ялоўку пяць кіламетраў жвіроўкі, галоўным чынам між маладняку. У Ялоўку аўтобус увозіць туман пылу, уязджае на брукаваную вуліцу, каб той пыл крыху з сябе паабтрасаць.

У Ялоўцы аўтобусны народ напраўляецца ў касцёл, я — у супрацьлеглым напрамку, па асфальтавай шашы. І таксама даходжу да касцёла, а дакладней — да касцельных руін. Побач мужчына на мыліцах, прыйшоў з недалёкага Дома сацыяльнай апекі. Крыху распытваю яго пра зруйнаваны храм. Веды ў яго на гэты конт даволі агульныя, але кідае мне і цікавінку: калі гэты касцёл у час вайны разбурылі адступаючыя немцы, пробашч памёр у некалькі дзён пасля гэтага няшчасця; пахаваны ён на недалёкіх старых каталіцкіх могілках.

Заходжу і на згаданыя могілкі. Відаць там дбайнасць нашчадкаў пра памяць аб продках. І відаць, што суб’ектыўная памяць майго нядаўняга размоўцы не супадае з памяццю парафіян, запісанай на помніку: згаданы ксёндз Картановіч сапраўды памёр тыдзень пасля... выбуху другой сусветнай вайны.

За могілкамі дарожны знак забароны ўсялякага руху. Якіх дзвесце метраў за ім перакрывае шашу глухая гранічная брама, за якой нядаўняя „шостая частка свету”. Яшчэ дзесяць гадоў таму падвозіў я пад тую браму сваіх сваякоў, замежных.

Вяртаюся ў Ялоўку. Іду вуліцай Ліпавай. Насціл на ёй з пясочку, на якім сляды легкавушкі, веласіпеда, абутку, каня, сабак... Паралельная вуліца, Дворная — адзіная брукаваная ў Ялоўцы. У некаторым ад яе аддаленні будынак накшталт святліцы, у якім — паводле шыльды — прымае лекар. Двое маладых людзей нечага чакаюць.

Нейкіх трыццаць гадоў таму наведаў я Ялоўку ў першы раз. Направіўся я сюды з боку Падазеран, грунтовай дарогай. Сярод чыстага поля занепакоіўся я, ці не заблудзіў. Акурат трапілася нейкая бабулька, у якой я і пра Ялоўку запытаў. „А вось”, — сказала яна мне, паказваючы на блізкае кустоўе. Гэта была праўда. Сёння вуліца, па якой я тады ўехаў, называецца Беластоцкай. Ад палявой дарогі розніца яна мо толькі тым, што між збожжа было мо крыху менш пяску чым між кустоў.

З боку Шымкаў будынак, якога від паказвае, што ў яго багаты ўласнік.



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

*Царква Уздзвіжання св. Крыжа*

Уласнік суседняй хаты абівае яе шалёўкай. Спыняюся каля яго, распытваю пра мясцовую тапаграфію, а найперш пра касцёл, у якога вонкавым відзе падазраваю былую сінагогу...

Мая здагадка, аднак, фальшывая. Сінагога ў Ялоўцы была, але ў іншым месцы. Дзе дакладна, мой суразмоўца, народжаны ў недалёкіх Ганчарах, не ведае. Інфармуе мяне затое пра кіркут, які быў з боку Кандраткаў. Астаўся на ім бадай толькі адзін намагільны камень. Гэтыя камяні былі з пясчаніку, які выдатна надаваўся для вырабу тачылаў для вастрэння жалезных прылад...

Яўрэі складалі каля 60% даваеннага насельніцтва Ялоўкі. 2 лістапада 1943 года іх не стала.

Побач нас праязджае некалькі машын. Гэта жалобнікі, што пахавалі згаданага пакойніка з Лявоневіч, едуць у згаданую святліцу, дзе адбудзецца вячэра...

Згаданы раней будынак ад Шымкаў сапраўды мае багатага ўласніка, гэта суполка „Europol-Gaz” з Кандраткаў, якая займаецца перапампоўваннем ямальскага газу ў Еўропу. Сёння ў гэтым будынку гатэль. Раней, да 70-х гадоў мінулага стагоддзя, працавала ў ім школа, пабудаваная ў канцы XIX стагоддзя. Тады была ў ім духоўная семінарыя, у якой м.інш. навучаў Пётр Крэчэўскі — будучы старшыня Рады БНР. А вучыўся ў ёй вядомы чытачам „Нівы” а. Уладзімір Гарустовіч, аўтар м.інш. бежанскіх успамінаў.

Сённяшні Праабражэнскі касцёл, які я палічыў былой сінагогай, мае даволі складаную гісторыю. Пабудаваны ён у 1859-1862 гадах, магчыма дзеля ратунку ад эпідэміі халеры і тыфу, якая сеяла там смерць з 1855 да 1861 года. Неўзабаве ўспыхнула студзеньскае паўстанне 1863 года, да якога з Ялоўкі далучылася каля сотні дабравольцаў. Пасля скарэння паўстання царскія ўлады адабралі каталікам касцёл і ўсталявалі ў ім царкву Аляксандра Неўскага, побач якой і пабудавалі пасля згаданую семінарыю. Пасля першай сусветнай вайны касцёл вярнуўся ў свой будынак.

Пакуль, аднак, гэта сталася, з настаннем перыяду „талерантнасці” пасля рэвалюцыі 1905 года ў Расіі, мясцовыя каталікі пабудавалі ў 1910 годзе новы касцёл святога Антонія, знішчаны, як ужо згадвалася, немцамі ў 1944 годзе. Была думка адбудаваць яго, але, мабыць, не было каму. Год ці два таму была збудавана толькі капліčка-паветка. Сёння руіны касцёла зарастаюць лесам, які не толькі падышоў да сцен, але і караскаецца на іх вярхі.



Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

*Руіны касцёла св. Антонія*

У 1944 годзе рухнуў не толькі касцёл св. Антонія — адступаючыя немцы разбурылі і мясцовую царкву. Нейкі час набажэнствы адбываліся ў будынку, накрытым саламянай страхой. У 1956-1966 гадах была пабудавана новая царква Уздзвіжання Крыжа Гасподняга; быў гэта першы сакральны аб’ект Аляксандра Рыгаровіча, пазнейшага архітэктара больш вядомага гайнаўскага сабора. Царкоўная званіца вырастае з муру, складзенага з камянёў. Гэтыя розныя па велічыні камяні тадышні ялоўскі настаяцель Яўген Канаховіч ахвяроўваў як адэкватныя пакаянні за ягоныя грахі...

У Ялоўцы сёння адны могілкі, на якіх хаваюць і праваслаўных, і каталікоў. Аднак з асобных бакоў. Мо дзеля таго, каб Усявышняму зручней было падымаць на Страшны суд адных раней, а другіх на трынаццаць дзён пазней...

Сённяшні будынак Дома сацыяльнай апекі пабудаваны быў пасля вайны, калі за Ялоўкай усталявалася дзяржаўная мяжа. Была ў ім пагранічная застава. Сёння пагранічнікі прыязджаюць у Ялоўку з Міхалова.

Колькі ў Ялоўцы пражывае сёння людзей, я не цікавіўся. Працуюць тут дзве крамы. Ёсць каля чатырох трактароў, каля чатырох кароў і мо з шэсць коней. Сельскагаспадарчыя ўгоддзі вакол Ялоўкі, якія яшчэ ўсталі перад наступам лесу, абрабляюць людзі з іншых мясцовасцей.

У цэнтры Ялоўкі, у якой у мінулым пражывала нават каля сямі тысяч жыхароў, прамавугольны рынак. Вуглы рынку злучаны сцежкамі з новага польбруку. Пасярэдзіне рынку ўстаноўлены сёлета помнік каралю Жыгімонту Аўгусту, які ў канцы снежня 1545 года прысвоіў Ялоўцы гарадское права: „Zygmunt August król, na przyczynę królowej Bony, matki swej, prawo magdeburskie, którym i mieszczanie grodzieńscy sądzić się zwykli, miasteczkowi Jałówce postąpił i darował”.

Кароль Жыгімонт II Аўгуст быў піянерам еўрапейскай інтэграцыі. Збліжэнню Вільні і Кракава мела служыць закладанне гарадоў на памежжы Кароны і Вялікага княства. Не толькі Кнышын ці Тыкоцін мелі стаць закладкай новага цэнтра Рэчы Паспалітай. Атрымала свой шанс і Ялоўка. Яшчэ і цяпер згадваецца пра пагранпераход. Аднак геапалітычныя працэсы здаюцца спіхваць былы горад у яшчэ глыбейшы адхон.

Праўда, кароль Жыгімонт можа з помніка паслухаць цалкам сталічных аналітычных меркаванняў мясцовых мужчын:

— А ў новым жондзе будуць адны жыды!

**Аляксандр Вярбіцкі**

# Здзекаваліся ўсе

**Вёску Кусцінцы, што ў Кузніцкай гміне, новае стагоддзе хіба міне бокам. Калі тут нават нейкія адзінкі гаспадараць, дык толькі геркаўскай спадчынай; новых машын тут ужо няма. Захаваліся тут яшчэ колішнія садовыя дрэвы, высокія яблыні і грушы-дзічкі. У вёсцы яшчэ за семдзесят душ, большасць якіх дажывае з пенсій. Крыху жыхароў блёка, што пабудаваны пры „фэрме”, атрымлівае „засілак”. У вёсцы адно дзіця ў школьным узросце і на „фэрме” трое ці чацвёра.**

Заходжу ў адну з хат, у ёй трое пажылых людзей: пара гаспадароў і суседка. Гаспадар адразу дэкламуе вершык, які запамятаў з часу вайны: „Дурак Шэршань, піша вершам. Ляпей выгнаць самагонку і папіць усполку”. Калі прашу, каб паўтарыў верш, забывае. Зазначае, аднак, што верш напісаў сам Шэршань.

Да голасу прабіваюцца жанчыны, застаўляючы мужчыну адно прыслухоўвацца. Іхняя памяць таксама ўжо ажурная, блытаюць падзеі, пра якія я іх пытаю. Усё-такі пра некаторыя факты, якія яшчэ асталіся ў памяці з часу маладосці, стараюцца мне расказаць.

У Паўловічах да вайны жыў доктар Вячаслаў Блахавіцін, ён там ажаніўся з багатай дзяўчынай, Кулакоўскай, што 81 гектар мела. Ён не меў польскага падданства і не меў права афіцыйна лячыць. Аднак ён ставіў добрыя дыягназы і аптэкарка ў Кузніцы выдавала лекі на яго рэцэпты. Ягоны сын Грыгорый, якога звалі Годзікам, вучыўся ў гімназіі ў Вільні. Як напалі немцы, доктар накіраваўся ў Вільню да сына, але не даехаў і з немцамі вярнуўся ў Паўловічы, а пасля ўся сям’я, у тым ліку і Годзік, пераехалі ў Кратошын, дзе жылі іхнія сваякі. То пасля вайны ад нас яшчэ ездзілі да Блахавіціна ў Кратошын, каб у яго лячыцца. А Годзік ажаніўся з папоўнай з Крынак і пасяліўся ў Гданьску.

Калі сюды прыйшлі саветы, то дзялілі маёнткі, забіралі жывіну. У нас быў манеж і адзін з саветаў пытаецца:

— А чьё это гу-гу-гу?

— Наша.

— Вы кулаки!

Забіралі толькі багатым, а бедныя ішлі і разбіралі. З Кусцінцаў у Сібір нікога не вывезлі, толькі з Сярпейкаў беднага пана Ліпінскага.




Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРВІЦКАГА

*Надпіс на крыжы між Кусцінцамі і Крыштапаровам*

У Паўловічах зямлю бедным саветы раздавалі. А як немцы наступалі, то паўвёскі спалілі. І аднаго забілі. Пасля дзве сям’і вывезлі ў Германію і некалькіх самотных; дзве асобы там прапала.

Калі прыйшлі немцы, то курыцу, што куранят вадзіла, злавілі, зарубалі і варылі. Кураняткам жыта насыпалі, а шчанятам і кацянятам макароны давалі. З немцамі быў чэх, які нас асцярог ад аднаго немца, што за пісталет трымаўся. То я куранят схапіла ў прыпол і ўцякла разам з татам.

Немцы горшыя ад рускіх былі. У Міленкаўцах пецярых дротам паявязалі і пабілі, а двум удалося ўцячы. Нашы тры вёскі — Кусцінцы, Валынцы і Сачкоўцы — немцы выселілі, бо штось тут мелі рабіць. Куды хочаш дзенься! Можна было сваю зямлю абрабляць, але жыць у гэтых вёсках нельга было. Калі ў якога гаспадара конь брудны быў, то таго гаспадара білі.

Калі саветы прыйшлі ў Паўловічы, то касцёр распалілі. Дровы на панадворку былі, але яны адколвалі вушакі ад акон і іх кідалі ў агонь. Калі нашы папрасілі, каб бралі дровы і хат не нішчылі, яны адказвалі:

— Мы своих голов не жалеем, а ты свой дом жалеешь!

І кросны рубалі, і ўсё.

Спярша граніцу каля саміх Кусцінцаў устанавілі, а пасля адкінулі кіламетр далей, пад Дубніцу. Саланіннікі пасля вайны жыць нам не давалі. З многіх вёсак людзі павыязджалі, бо гаварылі ім:

— My chcieli żeby jedna Polska była, żeby nie było kacapów.

Многія з нямецкіх вывазак не вярнуліся, толькі там асталіся жыць. А наша вёска ўсё сядзела як мыш пад венікам, толькі адна сям’я выехала, бо пастрашылі. У Даўгасельцах абстрэльваліся і двух саланіннікаў падстрэлілі, але з тае хаты, што абстрэльваліся, пасля паўцякалі...

Пытаю маіх суразмоўцаў пра ўквечаны агародчык, што красуецца пад акном суседняй хаты. У адказ чую, што садзіла іх суседка, якую дзень раней забрала ў шпіталь скорая дапамога...

Саланіннікі не дакончылі сваёй чысткі, канчае яе час. За гадоў дзесяць Кусцінцы пакіне тое адзінае дзіця, што яшчэ ходзіць у школу. Астанецца адна Польшча...

**Аляксандр Вярбіцкі**

# Легенда аб малым народзе



*Калі за вокнамі ды ўва мне выбухае залатая восень, маю ахвоту акунуцца ў лагодным спакой, бясчассе і з дупла самоты паўзірацца на тое, што дзеецца па-за мною, што незалежна ад мяне пераплывае, праміна. А ці гэта так без мяне, без майго ўдзелу?*

*Запісваю думкі, бо Бог імі надзяляе; бывае, што толькі адзін раз на працягу ўсяго майго жыцця — як заўважыў дацкі мудрэц Сёрэн Кіркегор. А верыць у Бога значыць разумець пытанне аб сэнсе жыцця — дадаў геніяльны аўстрыец Людвіг Вітгенштэйн.*

*І я спрабую забрацца да цытавання, калі распасціраецца прыгожае, сонечнае пасляпоўдне, забываючы на асцярогу іншага мудраца Эдмунда Гусерля: Не філасофіі, а самі рэчы і праблемы мусяць быць імпульсам для сапраўдных роздумаў.*

*Калі спыталіся ў польскага філосафа Станіслава Бжазоўскага, чаму ўсё спасылаецца на думкі іншых аўтараў, незалежна ад таго, што ён сам, уласнымі сіламі, умее ж дайсці да падобных высноў, адказаў: „Калі падпішуся ўласным імем ды прозвішчам, дык мне не паверацць, а перад чужамоўнымі аўтарамі адчуваюць павагу!”*

*Мушу, усё ж, пагадзіцца з тым, што незлічоная колькасць панняцяў хоць бы з абсягу постмадэрнізму перайшла ўжо, можа і назаўжды, у моўнае абсталяванне сучасных інтэлігентаў. Гэта засмечванне розуму, ці мо немінучы факт, неабходны.*

*А хацелася б быць чалавекам кнігі, які ўзахлёб штудзіруе новыя з’явы, папаўняе веды, перадае іх бліжнім, патомкам. А тут збоку далятае думка псіхолага, што, мабыць, гэта хвараблівая нейкая манія, то ўсё мэтазгаванне над літаратурай, тая натуга вачэй ды розуму.*

*Тыя і іншыя заўвагі занялі маю ўвагу пасля наведання новай мастакоўскай кавярні. Узяў голас, вось, вядомы паэт-постмадэрніст. Даказваў вельмі дынамічна, што немагчымае існаванне малога народа, паколькі большасць яго прадстаўнікоў жадае расплысціся ў суседскім вялікім народзе. Малы народ адораны малой культурай, у дадатак выдуманай, мабыць, жменькай заблуканых у прасторах гісторыі інтэлігентаў, а вялікі народ прадстаўляе гістарычную моц, а ягоная вялікая культура павінна быць узорам для таго малога народа. Нічога няварта тая заўзятасць жменькі інтэлігентаў, якая ўпіраецца за сваю адасобленасць. Паэт сціх, дапіў піва ў шклянцы і пераможна акінуў зрокам змрочную залу.*

*— Вось тут маем перад сабою прыклад сучаснага інтэлектуала, — спыніў маўчанне стары прафесар універсітэта. — Такі інтэлектуал становіцца на баку магутнасці, сілы і ўлады, жадае яе, у захапленні ад яе. Даўней інтэлектуалы бралі ў абарону тыя з’явы культуры, якім была наканавана гібель, дбалі аб іх, бралі пад сваю апеку. Мароз смерці, павеў крыла анёла знішчэння пранікае мяне, калі чую падобныя думкі. Хоць на вуліцы такі цёплы, сонечны час пасля асенняга поўдня.*

**Ежы Плютовіч**

# Міхасёва сям’я

*Міхась нарадзіўся на пачатку трыццатых гадоў мінулага стагоддзя ў беднай мнагадзетнай беларускай сям’і. Дзве яго малодшыя сястры памерлі маленькімі. Найстарэйшая сястра, Ганна, яшчэ пры санацыі выйшла замуж у суседнюю вёску. У 1940 годзе, калі нашую тэрыторыю занялі саветы, яе мужа Валодзю прызвалі ў армію. Трапіў ён у Асавец у рабочыя батальёны. Там будавалі абаронную лінію і быў ён пры будове бункераў. Калі нямецкі агрэсар напаў на Савецкі Саюз, Валодзя з Асаўца пешшу дабіраўся дадому. Каля мясцовасці Жэдня напароўся на нямецкую часць і трапіў у палон. Немцы Валодзю разам з палоннымі завезлі ў Нямеччыну, у лагер. Як добрага шаўца ўзялі яго ў майстэрню, дзе ён рамантаваў старыя і шыў новыя боты. Так прабыў у лагеры да заканчэння вайны. Іхні лагер вызвалілі амерыканскія часці, і калі Валодзя сказаў, што з’яўляецца беларусам і хоча вярнуцца на радзіму, яго перадалі ў рускую зону. Там палічылі яго здраднікам і адправілі ў шахты ў Данбас. Адтуль адпусцілі яго ў 1946 годзе. Вярнуўся Валодзя ў родную вёску да бацькой і жонкі. Нарадзіўся ў іх сын Анатоль. Пабудавалі яны вілу ў Беластоку і перасяліліся туды на пастаяннае жыццё. Цяпер ужо няма ў жывых Міхасёвага швагра Валодзі і сястры Ганны, а ў віле жыве сын са сваёй сям’ёй.*

*Другая Міхасёва сястра, Вера, пасля вызвалення нашай зямлі Чырвонай Арміяй, у мясніцы 1945 года выйшла замуж за Ігната, у сваёй вёсцы. Цяпер яны, як пенсіянеры, жывуць шчасліва, а іхнія дзеткі раз’ехаліся па краіне, маюць свае сем’і і жывуць згодна ў шчасці.*

*Старэйшы Міхасёў брат, Васіль, у 1946 годзе пайшоў працаваць у міліцыю і забяспечваў парадак, устанаўляючы народную ўладу. На жаль, не прыйшлося яму доўга пажыць. У 1947 годзе яго забіў атрад „Бурага” ў Высокамазавецкім павеце. Міхась па сённяшні дзень не можа адшукаць магілу свайго брата, каб паставіць бярозавы крыж ды каб святар хоць разок памаліўся і пасвяціў ягоную магілу. Па сённяшні дзень Міхась жаўнераў атрада „Бурага” называе злачынцамі-бандытамі.*

*Міхась, астаўшыся адзіным сынам у бацькоў, быў вымушаны астацца на гаспадарцы, каб годна „дагадаваць” сваіх бацькоў. Ажаніўся Міхась з Марыяй у 1953 годзе і пражывалі разам з бацькамі на гаспадарцы. Маці дапамагала выхоўваць дзетак ды памагала пры гаспадарцы. Памерла маючы 88 гадоў, а бацька пражыў 92 гады.*

*Раз’ехаліся і Міхасёвы дзеткі па краіне. Адны жывуць далей, другія — бліжэй. Яны час ад часу наведваюць бацькоўскую хату. Адным жывецца добра, іншым горш, але яны паміж сабою жывуць у згодзе. Цяпер Міхасю і ягонай жонцы Марыі больш за 70 гадоў. Жывуць дружна, кахаюць усіх сваіх дзетак, унукаў і праўнукаў. Хаця самі маюць невялікія сялянскія пенсіі, але час ад часу дадуць штосьці ўнукам і праўнукам. Міхась з Марыяй дажываюць восень свайго жыцця і кажуць: каб яшчэ крыху пажыць, пакуль усе ўнукі ўладкуюць сваё жыццё і абзавядуцца сваімі сем’ямі.*

**Ярош**

*У кнігарні дзейнічае скідка, калі наведвальнік набудзе тавараў больш чым на 20 000 беларускіх рублёў (каля 30 злотых)— паштовая перасылка будзе бясплатнай...*

# p-bukinist.at.tut.by

Правілам добрага тону называюць наведванне кнігарняў. Людзі заходзяць туды часцяком не з адмысловым жаданнем купіць нейкую кнігу, а папросту скароціць час ці пазнаёміцца з навінкамі кніжнага свету. І раптам з’яўляецца жаданне набыць гэтую кнігу, і цана яе ўжо не падаецца надта высокай.

Нешта падобнае можна адчуць і на сайце „Полацкі букініст", што месціцца ў Інтэрнэце па адрасе http://p-bukinist.at.tut.by. Зразумела, пагартаць старонкі тут не ўдасца, бо знаходзімся мы ў віртуальным магазіне.

Калі мы трапляем на гэты сайт, то ён насамрэч нагадвае сапраўдную кнігарню. У адрозненне ад іншых вэб-старонак, тут няма тлумачэння навошта і з якімі мэтамі быў створаны дадзены сайт. Наўрад ці хтосьці, заходзячы ў звычайную кнігарню, задаваўся б падобным пытаннем аб ёй. Таксама і тут на нас нібыта глядзяць шафы з паліцамі, дзе выстаўленыя кнігі, якія ўладальнікі кнігарні выставілі на продаж.

Запрашэнне да пакупкі мусіць падахвоціць аб’ява, што адразу кідаецца ў вочы. У дадзенай кнігарні дзейнічае скідка, калі віртуальны наведвальнік набудзе тавараў больш чым на 20 000 беларускіх рублёў (каля 30 злотых)— паштовая перасылка будзе бясплатнай.

Далей на галоўнай старонцы месціцца паведамленне аб апошніх паступленнях. Гледзячы на пералік кніг, прыходзіш да высновы, што гэтай невялікай інтэрнэт-кнігарні ёсць што прапанаваць пакупніку.

Цяпер звернемся да „шафаў з кнігамі", гэта значыць да іншых старонак сайта. Цікава, што гэтае дзяленне з большага не тэматычнае, а жанравае.

Першая рубрыка „Часопісы і газеты". Пэўна, яна найбольш вартая букіністаў, бо тут прапануюцца перыядычныя выданні хоць недалёкага, але ўсё ж мінулага. Праўда, ёсць і свежыя, як напрыклад, часопіс „Наша Вера" № 1 за бягучы год.

Рубрыка „Проза" прапануе досыць вялікі спіс кніг розных аўтараў і розных гадоў. Тут мы знойдзем выданні аўтарства Васіля Быкава, Алеся Адамовіча, Яна Баршчэўскага, Уладзіміра Караткевіча і іншых класікаў і сучаснікаў беларускай літаратуры. Тое самае тычыцца і наступнай старонкі „Паэзія". Праўда, пералік прапанаваных выданняў там значна большы. Няўжо пісаць вершы лягчэй за апавяданні?

Рубрыка „Кнігі па мастацтву", праўдападобна, больш за „Часопісы і газеты" прыйдзецца даспадобы аматарам недалёкай даўніны. Адны толькі назвы „СССР — наша Радзіма", „Ідэі Леніна жывуць і перамагаюць" чаго вартыя!? Зразумела, у спісе ёсць і кнігі больш карысныя мастацтвазнаўцам і культуролагам — „Беларуская кніжная графіка 1960-1990-х", „Беларускае барока", „Падляшскі спеўнік" і іншыя.

Рубрыка „Пераклады" прапануе наведвальнікам замежную літаратуру, перакладзеную на беларускую мову. Сярод іх творы Пастарнака, Міцкевіча, Марцінкявічуса, Сімянона і многіх іншых сусветна вядомых літаратараў.

Рубрыкі „Навука" і „Краязнаўства" ў нечым падобныя адна на адну. Відаць тым, што ў абедзвюх можна знайсці навуковыя погляды і даследаванні, якія непасрэдна тычацца Беларусі.

Не забыліся ўладальнікі „Полацкага букініста" і пра падрастаючае пакаленне. На сайце маецца старонка „Дзіцячая літаратура". А пра найбольш папулярныя кнігі гэтай кнігарні ёсць магчымасць даведацца на старонцы „Рэйтынг".

**Уладзімір Лапцэвіч**

*Кацярына Карстан (акадэмічнае веславанне) у японскім горадзе Гіфу стала трохразовай чэмпіёнкай свету. Да гэтага былі вікторыі ў Францыі і ў Канадзе...*

# Беларусь, беларусы...



Вераснёўскія адзнакі

Верасень, расчараваўшы беларускіх заўзятараў паразамі мужчын баскетбалістаў і футбалістаў, дыскваліфікацыяй на два гады канькабежкі Анжалікі Кацюгі, парадаваў усё ж дасягненнямі ў іншых відах. На гэты раз у нашым традыцыйным топ-парадзе за першы месяц восені апынуліся і новыя імёны. Прытым мы не сталі падзяляць дуэты батутыстаў і тэнісістаў, паставіўшы іх на адну прыступку.

1. **Мікалай Казак** і **Уладзімір Какорка** (скачкі на батуце). Беларускі дуэт стаў чэмпіёнам свету ў нідэрландскім Эйндховене. І хай нашы перамаглі не ў алімпійскай дысцыпліне, важкасць дасягнення значная.

2. **Юрый Рыбак** (дзюдо) стаў бронзавым прызёрам чэмпіянату свету ў абсалютнай катэгорыі, што прайшоў у Егіпце. Можна толькі парадавацца за дасведчанага спартоўца, якому так часта не шанцавала. А на гэтым чэмпіянаце спярша заняў ён 5-е месца ў катэгорыі да 100 кг, а потым выступаў у абсалютнай.

3. **Андрэй Казусёнак** (дзюдо) дасягнуў такога ж поспеху, але сапраўды здзівіў, бо ад дэбютанта такіх спаборніцтваў медаля не чакалі. Варта адзначыць, што беларускія дзюдаісты выступалі без шэрагу лідэраў каманды, але здолелі паўтарыць сваё лепшае дасягненне на чэмпіянатах свету двухгадовай даўніны.

4. **Уладзімір Валчкоў і Максім Мірны** (тэніс) у Кубку Дэвіса не здзейснілі нічога надзвычайнага. Але валявая перамога ў гасцях, хай сабе і над сціплай у тэнісе Канадай, дазволіла захаваць месца сярод 16-ці мацнейшых дружын свету. У новым розыгрышы супернікамі нашых стануць вельмі моцныя іспанцы, якіх беларусы будуць прымаць у Мінску.

5. **Іван Ціхан** (лёгкая атлетыка) выйграў фінал серыі Гран-пры, перамогшы і на апошнім этапе сезона. Адначасна хіба канчаткова знялося пытанне пра лепшага спартоўца года Беларусі.

1. **Кацярына Карстан** (акадэмічнае веславанне) у японскім горадзе Гіфу стала трохразовай чэмпіёнкай свету. Да гэтага былі вікторыі ў Францыі ў 1997 годзе і ў Канадзе ў 1999 годзе. І вось яшчэ адно вышэйшае дасягненне фенаменальнай вясляркі на вадзе краіны ўзыходнага сонца.

2. **Надзея Астапчук** (лёгкая атлетыка). Наша штурхальніца ядра роўна прайшла ўвесь сезон, дэманструючы значную перавагу над канкурэнткамі. Выйграла яна і фінал Гран-пры, атрымаўшы прытым 30 тысяч долараў прызавых.

3. **Ала Цупер** (фрыстайл) на першых двух этапах, якія прайшлі ў Аўстрыі, новага розыгрышу Кубка свету „разжылася" срэбраным і бронзавым медалямі. Старт іншых нашых фрыстайлістаў таксама абнадзеіў. Усяго фрыстайлісты „адскочуць" 11 этапаў.

4. **Вікторыя Азаранка** (тэніс) перамагла ў Нью-Йорку на „US Open" сярод юніёрак. Гэта яшчэ адзін тытул у сезоне нашай „зорачкі" на турнірах „Вялікага шалому".

5. **Юлія Барысік** (дзюдо) была блізкая да п’едэстала на чэмпіянаце свету ў абсалютнай вагавай катэгорыі, але ў выніку траўмы стала толькі пятай.

Камандай жа месяца назавем жаночую баскетбольную дружыну, якая не толькі выйграла турнір у сваёй адборавай групе, але і паставіла мэтай заваяваць пуцёўку на пекінскую алімпіяду.

**Уладзімір Хільмановіч**

# Зачараваная машына

*— Куды ты так прэшся, як голы ў лазню? — не вытрымаў Зміцер пасля таго як машына, нібыта спрабуючы даказаць, што хуткасць гуку апярэдзіць можа не толькі самалёт-знішчальнік, ледзьве ўпісалася ў паварот. — За рулём трэба думаць не тым месцам, на якім сядзіш, а хаця б патыліцай. Хіба хочаш адразу знішчыць усю гродзенскую апазіцыю? Глядзі! Не абы-каго вязеш, а гонар нацыі.*

*Пасажыры старэнькай, дабітай здзекамі і недаглядам „Аўдзюхі" весела зарагаталі, кінулі яшчэ пару-тройку жартаў у бок шафёра і з маньяцкім імпэтам сталі рабіць выгляд, што рыхтуюцца да сур’ёзных выступаў. У гэты дзень хлопцы сапраўды вельмі спяшаліся. Партыйны з’езд у Мінску вось-вось павінен пачацца, а яны былі толькі напаўдарозе.*

*— Не такія вы ўжо і важныя, — паспрабаваў аджартавацца Віктар, наўмысна выпусціўшы з рук руль, каб паказаць што не спалохаўся, хоць сэрца было ўжо ў пятках, а можа нават у сандалях. — Такім палітычным дзеячам як вы ў кожным калгасе можна знайсці замену.*

*— Хопіць нам калгасных палітыкаў, — зараўлі ў адзін голас пасажыры так, што заглушылі гук машыны, якая ўжо тыдзень як згубіла выхадную трубу і тарахцела мацней чым батальён танкаў узору Т-34.*

*— Ну то сядзіце і не рыпайцеся, — не здаваўся Віктар. — Як вы збіраецеся змяніць сітуацыю ў краіне, калі нават на машыне баіцеся ездзіць? Трасецеся як коні ў космасе. А баяцца няма чаго. Мая машына зачараваная. Ні з ёй, ні з тымі хто ў ёй ніякіх непрыемнасцей стацца не можа, хоць і тармазоў няма, і колы лысыя. Гэта тэхніка адзіная і унікальная. Ёй нават шафёр непатрэбны. Усё адно рулявая сістэма не працуе.*

*— Пахвалішся як даедзем да сталіцы, якая смела глядзіць назад у будучыню, — паспрабаваў жартам перавесці размову на іншую тэму Сяржук. Ён быў вельмі забабонны і не любіў апоўедаў пра праблемы з машынамі падчас язды.*

*Але „Аўдзюха" неслася так хутка, што іншыя тэмы не прыжываліся. Заставалася толькі павярнуць шафёру на слова, што гэтае карыта на калёсах сапраўды зачараванае.*

*У Мінск машына ўляцела з хуткасцю ракеты. Быў выхадны дзень і транспарту на дарогах было няшмат, таму Віктар, дзеля эканоміі часу, рызыкнуў праехаць на чырвоным колеры святлафора. Але толькі машына перасякла скрыжаванне, як на дарогу, што чорт з торбы, выскачыў міліцыянт і замахаў сваёй паласатай палкай.*

*— Ну што, давыпендрываліся, — прастагнаў Зміцер. — Зараз за такое парушэнне пазбаўляюць правоў. Добра калі тваю зачараваную трухляціну не забяруць.*

*— Сапраўды, уляпаліся, — адгукнуўся Віктар. — Няма выхаду. Трэба зараз прыдурвацца да канца. Горш не будзе.*

*Ён паклаў рукі на руль і стаў цярпліва чакаць міліцыянта. Той не спяшаўся. З важным выглядам, нібыта яму аднаму ўдалося знішчыць усю арганізаваную злачыннасць на Беларусі, ён падышоў да машыны і пастукаў у шыбу. Шафёр апусціў шкло і сурова зірнуў у вочы міліцыянта.*

*— Ты што, канапель абкурыўся? — злосным голасам звярнуўся ён да ахоўніка парадку. — Ты чаго пад калёсы кідаешся? Цябе што, начальства паставіла на дарогу і не растлумачыла, каго можна спыняць, а каго не?*

*У міліцыянта ад такога нечаканага нахабства вочы расшырыліся як у жабы, якая выпадкова праглынула варону. Ён стаў успамінаць твары сталічных кіраўнікоў, але чалавек, які быў перад ім, паранейшаму здаваўся незнаёмым. Інстынкт самазахавання падказваў, што лепш высветліць што за шышкі сядзяць у машыне. Ён глянуў на нумарны знак, але і гэта нічога не дало.*

*— А вы хто? — нарэшце праразаўся яго нерашучы голас.*

*— Ну вось табе і раз, — Віктар дастаў цыгарэты і не спяшаючыся закурыў. — Каго ў міліцыю панабіралі?! Ужо адміністрацыю прэзідэнта не пазнаюць. Хутка і самога прэзідэнта пераблытаюць з якім бэнээфаўцам.*

*У паліцыянта адначасова затрэсліся левае века, правая шчака і калені. Ён ступіў крок назад, прыклаў далонь да фуражкі, глынуў сліну і дрыжачым голасам ледзьве выдыхнуў:*

*— Праязджайце, калі ласка...*

*Віктар няспешна завёў машыну і наўмысна, не ўключаючы паварота, адразу перасек тры дарожныя палосы.*

*— Сапраўды машына зачараваная, — зарагаталі хлопцы і павярнуліся, каб паглядзець на міліцыянта.*

*Выгляд у таго быў такі здзіўлены, як у дзяцей школьнага настаўніка працы, які ў дзень зарплаты з’явіўся дахаты рана і цвярозы. На разгубленым твары міліцыянта, які глядзеў на ад’язджаючую машыну з наклеенай на багажніку выявай забароненага ўладамі бел-чырвона-белага сцяга, можна было заўважыць, што ён на 99 адсоткаў не паверыў Віктару. Не можа быць, каб адміністрацыя прэзідэнта ездзіла на такой старой машыне ды яшчэ размаўляла па-беларуску. Але раптам... Пасля бяды не абярэшся. Лепей перастрахавацца.*

**Генрых Зладашмянскі**

# Адпачынак на „Купале”

**„Купала” Ірыны і Зіновія Галёнкаў у Арэшкаве-Парыеве распалажана на ўскраіне Белавежскай пушчы. Гэта казачнае месца для адпачынку на ўлонні прыроды. Аматары жывёл узрадуюцца непасрэдным кантактам з фаунай у міні-заапарку (хатнія птушкі, фазаны, страусы, коні, в’етнамскія свінкі, дзікі, свінадзікі, срэбныя лісы). Можна пабудзіць, спячы на вогнішчы каўбаску ці ўвэндзіць у вяндлярні, паглядзець міні-музей з даўнімі хатнімі і сельскагаспадарчымі прыладамі ды паслухаць цудоўных беларускіх песень з кампакт-дыскаў або ў прамым выкананні ў час мерапрыемстваў.**



Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

*Назіральная вышка*

Гаспадарка дзейнічае каля дзесяці гадоў і хаця яна, як кажуць уладальнікі, нерэнтабельная, далей будзе служыць і развівацца. На ўтрыманне гаспадаркі ўкладваюцца даходы з арэшкаўскай філіі варшаўскай фірмы „Зэгір”.

— Што памянялася ў гаспадарцы за апошні час? — пытаю Зіновія Галёнку.

— Ад нядаўна працуе „Карчма”, драўляны будынак, у якім прыбывае выкананых з драўніны і сталі помнікаў мінулага Гайнаўскай зямлі — усяго, чым калісь карысталіся сяляне; найстарэйшым экспанатам з’яўляецца драўляная барана з Арэшкава. У „Карчме”, якая можа змясціць трыццаць асоб, ёсць таксама кухня, дзе можна нарыхтаваць любыя стравы.

У апошні час дабудавалі мы назіральную вышку. Хаця яе вышыня крыху за дзесяць метраў, аднак з яе ўжо відаць навакольныя паселішчы, сцяну Белавежскай пушчы, сямействы буслоў, лісоў у суседа, палюючых катоў ды птушак, сядаючых на лініі электраперадач. Можна карыстацца біноклем і падзорнай трубой.

На „Купале” пабольшала таксама пастаянная экспазіцыя конных сельскагаспадарчых машын. Не хапае яшчэ толькі манежа і сячкарні. Для праездак ёсць брычка, а на зіму — конныя сані.

— Якія змены ў звярынцы?

— Убылі тарпаны, таму што малое імі зацікаўленне турыстаў. Замест іх з’явіліся кабылы для праездак верхам і ў брычцы. Новымі набыткамі з’яўляюцца таксама дзікі, свінадзікі і в’етнамскія свінкі. Новых жывёл набываем шляхам абмену з іншымі жывёлаводамі, затое абмен вопытам выглядае па-рознаму. Ёсць людзі, якія лічаць нас канкурэнцыяй і з імі няма як дагаварыцца, але ёсць і людзі адкрытыя. Зараз наглядаецца вялікае зацікаўленне чорнымі авечкамі, бо яны не хвараюць і выконваюць ролю экакасілак. У нашых ставах выраслі рыбы, якія — як карпы ці амуры — важаць па некалькі кілаграмаў.

— Ці многа турыстаў наведвае „Купалу”?

— Сёлета зацікаўленне большае, чым у мінулым годзе, аднак вельмі малое ў параўнанні з пазалеташнім, калі наведала нас каля паўтары тысячы асоб — дашкольнікаў і вучняў малодшых класаў; у мінулым годзе было сто, а сёлета ўжо каля двухсот. Было шэсць экскурсій — з Гайнаўкі, Кляшчэль, з-пад Ломжы, Беластока, Нарвы. Моладзь паводзіць сябе намнога культурней чым дарослыя.

— Як бачыце гэтае месца за пяцьдзесяць гадоў?

— Бачу тут парк, бо дрэвы, якім цяпер каля дзесяці гадоў, вырастуць яшчэ больш. Будзе сауна, два-тры кемпінгавыя домікі, ну і палац з чатырма вежамі, басейнам і залай біялагічнага абнаўлення. Міні-заапарк будзе задавольваць еўрасаюзныя патрабаванні адносна прабываючай там звярыны. З вясны будзем завяршаць будову начлежнага дома на дваццаць апартаментаў.

Не разлічваю на еўрасаюзную дапамогу, гэта прапаганда. Я дапытваўся, прабаваў, але нічога не дабіўся. Не знаю нікога ў наваколлі, хто б атрымаў на такую мэту еўрасаюзныя сродкі. У Арэшкаве еўрасаюзную падтрымку атрымаў уласнік пасекі, але што гэта мае супольнага з агратурызмам?

— Чаго спадзяюцца турысты, якія тэлефануюць вам?

— Пытаюць пра начлег, чакаюць высокага камфорту за нізкія аплаты. Цікавяць іх найперш пакоі з лазнямі, хаця гэта, на мой пагляд, не супадае з сапраўдным агратурызмам.

„Купалу” можна наведаць і паглядзець у Інтэрнэце на старонцы www.kupala.cp.pl.

**Міхал Мінцэвіч**

## У Трывежы

Жыхарам Трывежы стала выгадней гаспадарыць пасля камасацыі палёў у дзевяностых гадах. Размеркавалі тады таксама супольныя вясковыя лугі. Зараз многа зямлі належыць гарадскім выхадцам. Абрабляюць яе бацькі або суседзі.

— Калі паявіліся даплаты да сельскагаспадарчай прадукцыі, была ў людзей ахвота да гаспадарання. Зараз рукі апускаюцца, калі за тону жыта плацяць 150 злотых, а за тону пшаніцы 350 злотых. Калі надалей будуць такія ўмовы гаспадарання, то сельская гаспадарка пойдзе ў заняпад, — кажа Канстанцін Салавянюк. — Шкада таксама, што на нашых якасных землях не правялі яшчэ дрэнажавання.

Праект дрэнажавання палёў вакол Трывежы гатовы, але няма сродкаў на яго ажыццяўленне.

— Пры камуне цяжка было атрымаць будаўнічыя матэрыялы, але фінансава лягчэй было збудаваць дом. Зараз з сельскай гаспадаркі складана пабудаваць хату, — гаворыць Аляксей Давідзюк, які свой прыгожы дом будаваў яшчэ пры ПНРы.

У Трывежы была падставовая школа, але яе ўжо даўно закрылі. Апошнім часам у вёсцы крыху пабольшала колькасць дзетак у школьным узросце. У час летніх канікул вясковых бабуль наведваюць гарадскія ўнукі і тады вуліца напаўняецца гоманам. Калі бабулі яшчэ самі змогуць дабрацца ў магазін і наведаць суседак, радуюцца жыццём. Цяжкасці паяўляюцца, калі яны слабеюць.

— Мне дачка многа разоў прапанавала перабрацца да яе ў горад. Аднак я ведаю, што маладым цяжка жыць са старэйшай асобай. Забралі ад нас адну бабулю ў Гайнаўку і пасялілі ў блёку на чацвёртым паверсе. Сумуе яна, бо з акна бачыць адны машыны, — расказвае спадарыня Вольга. — Зараз мой дом запусцеў, бо самой цяжка сабраць сродкі на рамонт. Трэба купіць харчаванне і лякарствы. Каб абагрэць вялікую хату, трэба прыдбаць многа дроў. Добра, што дапамагаюць мне дзеці і ўнукі.

**(ам-з)**

## Адрэзак гісторыі на могілках

Мы з жонкай часта заходзім на нашы дубіцкія могілкі, каб падліць кветкі, пасаджаныя на магілах блізкіх, бо такая бывае засуха, што зямелька — як пух. Нашы могілкі дагледжаны належна, бо абгароджаны, пракладзена вада і агульны там парадак. Немалая ў гэтым заслуга нашага пачэснага бацюшкі Славаміра Аўксецюка. Я заўсёды прайду паміж магіл, прачытаю надпісы на крыжах. Ёсць там такія каменныя крыжы, якім ужо больш за 150 гадоў, і магіл ад іх ужо няма бо, відаць, радня іхняя звялася.

Каля дарогі, што вядзе ў Орлю, стаіць крыж з надпісам, што там пахавана Параскева Алесюк з Грабаўца, якая трагічна загінула 27 верасня 1937 года. У тую ноч ейны муж Грыша, у прыступе псіхічнага заняпаду, зарубаў яе сякерай. Тая падзея дакладна апісана ў кнізе „Пожня” нашага пачэснага літаратара Васіля Петручука.

Чаму я пра гэта пішу? А таму, што родная сястра гэтага Грышы Устынка выйшла замуж за майго дзеда Дзмітрыя Шуля пасля смерці ў 1946 годзе ягонай жонкі (маёй бабулькі) Агафіі. Устынка пражыла з дзедам сем гадоў, да ягонай смерці ў 1952 годзе. Гэтая бабулька Устына жыла на нашым панадворку да 1970 года са сваёй пляменніцай Марысяй, якую запрасіла з Савецкага Саюза, куды яна трапіла з братам Якавам пасля смерці іхняй мацеры Параскевы; былі яны ў нейкім польскім дзетдоме, з якога саветы забралі іх да сябе. Іхні бацька Грыша памёр у Харошчы. Пасля Устынка з Марысяй выбраліся ў Грабавец і сёння ўжо не жывуць. Гэта былі добрыя людзі, я адносіўся да іх як да сваякоў.

Скора мы ўсе апынемся на могілках, таму варта шанаваць памяць тых, хто ўжо адышоў і трэба дагледаць магілы.

**Мікалай Панфілюк**

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

**Nakład**: 1 434 egz.
**Выдавец**: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва”.
**Старшыня**: Яўген Вапа.
**Адрас рэдакцыі:** 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
**Тэл./факс:** (+48 85) 743 50 22.
**Internet**: *http://niva.iig.pl/*
**E-mail**: *redakcja@niva.iig.pl*

*Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.*
**Галоўны рэдактар:** Яўген Вапа.
**Намеснік гал. рэдактара:** Віталь Луба.
**Сакратар рэд.:** Аляксандр Максімюк.
**Рэдактар „Зоркі”:** Ганна Кандрацюк-Свярубская.
**Публіцысты:** Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
**Канцылярыя:** Галіна Рамашка.
**Камп’ютэрны набор:** Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
**Друкарня**: „Orthdruk”, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
**Prenumerata:** 1. Termin wpłat na prenumeratę na I kwartał 2006 r. upływa 5 grudnia 2005 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch” na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na IV kwartał 2005 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH” S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa”, Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

# Гараскоп на тваім целе

Існуе цэлая галіна астралогіі, якая прадказвае будучыню па радзімках з падрабязнымі дэталямі аб тым, што абазначае кожная з іх на пэўным месцы. Цікава, што гэтыя гараскопы розныя для жанчын і мужчын. Можам праверыць іх на сабе і на сваіх блізкіх.

Жаночы гараскоп

1. Радзімка на правым брыве альбо павецы — ранні шлюб.
2. У кутку вока — доказ спакойнага і ўраўнаважанага характару.
3. На правай шчацэ — прадказанне частых і бурных любоўных раманаў.
4. На носе — гарантыя поспеху ўсіх тваіх пачынанняў.
5. На губах — знак вясёлага нораву. Ты чуллівая, любіш раскошу, але пазбягаеш адказнасці. Радзімая пляміна над верхняй губой — сведчанне жаноцкасці, схільнасць да какецтва, пад ніжняй — стрыманасць у каханні.
6. Радзімка на грудзях справа сведчыць, што ты асоба крайнасцей, тваё жыццё поўнае ўзлётаў і падзенняў. Радзімая пляміна на грудзях злева — сведчыць аб шырыні натуры, дабрыні і легкадумстве.
7. Радзімкі на бёдрах прадказваюць шматлікае патомства: чым іх больш, тым больш будзе дзяцей.
8. На правым перадплеччы — знак поспеху, на левым — грашовых няўдач.
9. На кісці рукі, асабліва ў верхняй яе частцы — валоданне талентам, які рана ці позна выявіцца.
10. Цёмныя радзімкі на пальцах прадказваюць імклівую кар'еру і вялікае багацце.
11. На шчыкалатцы — ты незалежная, працавітая, поўная энергіі. У жыцці цябе нішто не спыніць.

**(мох)**

# „Даўціпы" Андрэя Гаўрылюка

Адзін прафесар не любіў, калі студэнты не прыходзілі на яго лекцыі і тым, што адсутнічалі, правальваў экзамены. Адзін студэнт пасля экзамену здзівіўся:

— Чаму правал? У мінулым семестры быў жа я на кожнай вашай лекцыі...

Прафесар збянтэжыўся і паставіў студэнту тройку. Наступны студэнт таксама сказаў, што ўсе лекцыі сядзеў за калонай і хаця нічога не ўмеў, таксама атрымаў тройку. Калі тое самае паўтарыў трэці студэнт, прафесар прычапіў на дзвярах у свой кабінет паведамленне: „Усе калоны ўжо заняты".

* * *

Бацька да сына, які збіраецца на акторскія штудыі:

— Не згаджаюся! Хочаш апаганіць наша прозвішча?

— Абяцаю, што буду выступаць пад фіктыўным...

— Таксама не згаджаюся! Бо калі станеш зоркаю, тады ніхто не паверыць, што я з'яўляюся тваім бацькам.

* * *

Адна суседка павучае другую:

— Вера, што чорны кот прадвяшчае няшчасце, гэта забабон! Не трэба такім катом хваляваццa, толькі хопіць тры разы плюнуць за левае плячо.



Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

*На Беласточчыне беларускім дыпламатам мус сядзець пад бел-чырвона-белымі сцягамі (справа): А. Сцепанюк (дырэктар бельскага ліцэя), Леанід Каравайка (генеральны консул РБ у Беластоку), Тадэуш Стружэцкі (пасольства РБ у Варшаве)*

## Афарызмы Ладзіка Майніча

** Жыцьцё складаецца з чорна-белых палосаў: чорныя — гэта калі ўсё кепска, а белыя — калі няма нічога добрага.*

** Калі чалавек пляне, Бог сьмяецца. Калі Бог пляне, чалавек плача.*

** Чаму вавёрка бегае ў коле? Таму, што яна дурная. Чалавек адрозьніваецца ад вавёркі толькі тым, што ён ня бачыць кола.*

** Калі ранішня жаданьні супадаюць з вячэрнімі, навошта класьціся спаць?*

** Усё міне, а тое, чаго не было, так і не надыдзе.*

** Не чакайце ад людзей дабра, тады ёсьць надзея, што яны ня будуць рабіць вам злога.*

## Адгаданка

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| | | | 8 | 9 | 10 | 11 |
| | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 | 17 |
| | | 18 | 19 | 20 | 21 | 22 |
| | 23 | 24 | 25 | 26 | 27 | 28 |

### Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — пагаворку.

1. негусты аўсяны кісель = 3 _ 7 _ 14 _;
2. вялікі памазок з пакулля для ўмяшчання вадкасці = 17 _ 15 _ 5 _ 25 _;
3. асобная частка шкілета чалавека = 1 _ 2 _ 8 _ 27 _ 28 _;
4. сродак міжчалавечых зносін і выказвання думак = 6 _ 10 _ 9 _ 22 _;
5. не ява і не мара = 18 _ 24 _ 4 _;
6. трэцяя ступень гамы = 23 _ 19 _ 20 _ 21 _ 26 _ 16 _;
7. гарбата = 12 _ 13 _ 11 _. **(ш)**

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

**Адказ на адгаданку з 35 нумара**

Бацька, бот, віза, вусы, дым, заяц, кіно, лёс, мех, міг, Нёман, ода, пыха, Сож, сум, танец, цень, Ціса, цыцка, чмут. Рашэнне: **Каб стаць славутым часам хопіць імгненне, каб астацца нікому невядомым зыходзіць усё жыццё.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Лукашу Пацэвічу** з Беластока і **Лявону Федаруку** з Рыбалаў.

# 09.10 – 15.10

**Баран (20.03. — 19.04.)** Не звязвайся з кімсьці ад страху астацца самотным. Пачакай сапраўднага пачуцця. Зоркі абяцаюць шмат грошай. Думкі аб стабілізацыі. „Немагчыма некалькімі шляхамі адразу прайсці адно жыццё".

**Бык (20.04. — 20.05.)** Блізкасць і гармонія ў пары альбо выставіш чамаданы за парог. Знакаміта зрэалізуешся ў ролі шэфа. 12-15.10. твой партнёр можа аказацца быць неадказным, нават непрыстойным. Нядобры час таксама на фінансавыя рашэнні.

**Блізняты (21.05. — 21.06.)** Цяжкасці ў паразуменні з атачэннем, бяссільнасць, нявера ва ўласныя сілы. Можаш захапіцца чужаземцам. Маеш шанц на павышэнне, толькі без нерваў! Навучыся выкідаць з сябе злыя эмоцыі, замест іх у сабе душыць.

**Рак (22.06. — 22.07.)** Зоркі спрыяюць фліртам і захапляючым любоўным гульням. На працы трэба падвучыцца, нават калі думаеш, што ты — вялікі спецыяліст. Сігналы, што тваё жыццё зменіцца. Мілая атмасфера на працы.

**Леў (23.07. — 22.08.)** Да 10.10. пастарайся добра адпачыць, альбо прынамсі добра правядзі вечары. 9-13.10. будзеш схільны да празмернай канцэнтрацыі на сваіх праблемах, рэальных і віртуальных. Больш дыстанцыі да сябе самога! Здзейсняцца твае сны!

**Дзева (23.08. — 22.09.)** Юпітэр дбае, каб прыбывала табе грошай. З 13.10. будзеш празмерна крытычны да знаёмых, і яны могуць страціць цярпенне да цябе. Стома ад працы і абавязкаў. Не зачыняйся на каханне!

**Шалі (23.09. — 22.10.)** Не дайся зводзіць, адкінь злое каханне. Грошы будуць падаць проста з неба. 12-16.10. могуць не ўдасца выязныя планы, не хапай сарака сарок за хвост.

**Скарпіён (23.10. — 21.11.)** Увесь наступны год (ад гэтага месяца) ты — дзіцё шчасця. Памагае табе Юпітэр, планета дабрабыту. Выкарыстай усе шанцы. 9-13.10. прытушы лішнюю эмацыянальнасць, бо выбухі злосці могуць зашкодзіць інтарэсам! Будзь асцярожны пры поўні і зацьменні Месяца — сілавыя развязкі могуць блага кончыцца.

**Стралец (22.11. — 21.12.)** Нават найбольш лянівыя могуць разлічваць на поспехі, асабліва ў фінансах. Спадабаешся, будзеш мець давер і прыхільнасць атачэння.

**Казярог (22.12. — 19.01.)** Любоўныя расчараванні пойдуць у карысць. Калі хочаш паваяваць за сваю пазіцыю ў фірме, варта рызыкнуць. Калі 10-14.10. памылішся, будзе гэта за табою доўга цягнуцца. Можаш баяцца без патрэбы.

**Вадалей (20.01. — 18.02.)** Ігрaй у адкрытыя карты, і калі не хочаш вязацца, не мані. Грошай яшчэ пачакаеш. 11-15.10. будзеш пранікнёны, пераканаўчы, зможаш аформіць усе справы. Парві з руцінай. З 12.10. праблемы ў фінансах і сяброўстве. Рэагуй рашуча, калі трэба. За тваімі неадказнымі паводзінамі стаіць боязь.

**Рыбы (19.02. — 19.03.)** Да 10.10. вялікая адвага і прадпрымальнасць. Лёс дае табе шанц прабіцца, а ў кар'еры памогуць жанчыны. „Першы крок і першы гузак ідуць у пары".

**Агата Арлянская**

ISSN 0546-1960